


Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДСКА-КУЛЬТУРНАГА ТАВАРЫСТВА

№ 42 (1077) БЕЛАСТОК 17 КАСТРЫЧНІКА 1976 г. ЦАНА 60 гр.



Аграмадны сілас для нарыхтоўкі паранай бульбы. Бо так шырока разгорнутая гадоўля патрабуе зусім новых спосабаў нарыхтоўкі кармоў.

БАГАЦЕЕ СПУЛДЗЕЛЬНЯ

Першы мураваны будынак, кароўнік для некалькіх дзесяткаў красуль, на спулдзельчым панадворку ў Вульцы Нурэцкай паявіўся, здаецца, у 1956 годзе. Пасля настаў час, неспрыяльны для калектыўных метадаў гаспадарання. Вульчанская спулдзельня, аднак, паспяхова яго перажыла, пашыраючы пастаянна сваю маёмасць.

— Што зараз чуваць у спулдзельцаў Вулькі Нурэцкай?

— Жывем нядрэнна, стараемся, каб было яшчэ лепш, — адказаў мне Мікалай Кусачук, які тут ужо шмат гадоў з'яўляецца кіраўніком прадукцыі. Ён сам з тутэйшых сялян. Разам з бацькам быў сярод тых 13-ці гаспадароў, што ў 1954 годзе арганізавалі сельскагаспадарчы кааператыў у Вульцы Нурэцкай. Завочна закончыў сельскагаспадарчы тэхнікум і стаў вопытным спецыялістам.

— Цяпер, — гаворыць ён, — наша спулдзельня аб'ядноўвае 50 сем'яў, якія супольна апрацоўваюць амаль 800 гектараў зямлі. На нас таксама ўскладзены абавязак загаспадарыць усе дзялянкі дзяржаўнага фонду зямлі, які тут накапляецца ў выніку таго, што старэйшыя сяляне масава аддаюць свае гаспадаркі дзяржаве ў замен за пажыццёвыя пенсіі.

— Як ураджай у гэтым годзе?

— Як на тутэйшыя ўмовы, ураджай добры. Жыта — 27 цэнтнераў, аўса — 35 цэнтнераў, а ячменю — аж 40 цэнтнераў з аднаго га.

— Ці вашы суседзі-аднаасобнікі могуць пахваліцца таксама высокімі ўраджаямі?

— А дзе ж там! Гэта нават голым вокам відаць было, калі параўнаць спулдзельчую і аднаасобную ніву.

— Адкуль тады такая розніца?

— У нас уся праца ў полі поўнасцю механізавана, даем высокія дозы мінеральнага і натуральнага ўгнаенняў. У сярэднім на 1 гектар высяваем цяпер аж 220 кг хімічна дзейсных элементаў (НПК). Адтуль і вынікі, нічога з неба.

Працяг на стар. 4



Тры матулі

З народнага

Меў аж тры матулі пехацінец
І не мог ніводнае пакінуць.

Маці, што салдата нарадзіла,
Мужнасцю, адвагай надзяліла.

А Радзіме-маці ён ніколі
Здрадзіць не пасмеў на ратным полі.

Са сваёй матуляю-зямліцай
Пехацінцу хіба разлучыцца?

Першая — салдата нарадзіла,
А другая — ваяваць вучыла.

Трэцяя — не запытаўшы згоды —
Да сябе забрала назаўсёды.

Анатоль Белавус

ХРОНІКА

■ 17 верасня ў Новай Волі, 18 — у Меляшках, 19 — у Валілах, 20 — у Гарадку і 21 — у Вейках (гміна Гарадок) адбыліся пасяджэнні праўленняў гурткоў БГКТ, на якіх абмяркоўваліся справы актывізацыі іх дзейнасці ў асенне-зімовым перыядзе. Шмат увагі было прысвечана рэгулярнаму аплочванню членскіх складчын і развіццю мастацкай самадзейнасці.

■ 19 верасня харавы калектыў БГКТ з Дубяжына і эстрадная група з Плёсак пад мастацкім кіраўніцтвам Пятра Нявінскага далі канцэрт на гмінных дажынках у Вульцы Тэрахоўскай (гміна Чарэмха), а вяртаючыся адтуль, выступілі на сцэне клуба ў Сухавольцах (гміна Кляшчэлі).

■ Сакрат Яновіч і Ян Чыквін 22 верасня правялі аўтарскія сустрэчы ў наступных школах: у Гарадку, Меляшках, Валілах і Вейках (гміна Гарадок) і ў вясковых клубах у Шымках і Навасадах (гміна Міхалова).

■ 22 верасня праўленне гуртка БГКТ у Беластоку на сваім чарговым пасяджэнні прыняло план працы да канца бягучага года. У гэтым плане многа ўвагі ўдзелена мастацкай самадзейнасці, дакладчыцкай дзейнасці, сустрэчам з цікавымі людзьмі, удзелу гуртка ў конкурсах ГП БГКТ, новым формам працы, у тым ліку і дыскусіі над савецкімі фільмамі. Затым праўленне прыняло ў рады БГКТ новых 30 чалавек, якія падпісалі членскія дэкларацыі. Такім чынам, гарадскі гурток БГКТ у Беластоку налічвае цяпер больш як 700 членаў.

■ 23 верасня Прэзідыум ГП БГКТ абмеркаваў справаздачу аб дзейнасці ў мінулым культурна-асветным годзе, зацвердзіў правілы конкурсаў (песеннага, драмгурткоў, дэкламатарскага) і разгледзеў некаторыя арганізацыйныя справы.

■ 26 верасня пасяджэнне праўлення навуковага гуртка БГКТ прысвечана было далейшым яго выданням. (мх)

Пуцяводныя думкі

Чалавек найбольшы поспех робіць у тым, чаму найбольш аддаецца.

Ф. Бэкон

Лёгкадумнасць глядзіць лёгка на рэчы сур'ёзныя і сур'ёзна на рэчы бязглуздыя.

Ж. Даламбер

Тое, што мы ведаем — абмежаванае, а тое, чаго мы не ведаем — бясконцае.

П. Лаплас

НЕЗВЫЧАЙНАЯ БІЯГРАФІЯ ЗВЫЧАЙНАГА ЧАЛАВЕКА

Цікавяць мяне людзі, якія трывала ўпісаліся ў гісторыю Белавежы. Прадставіў я іх ужо на старонках „Нівы" даволі многа, ды капальня незвычайных біяграфій усё-такі не вычэрпваецца. Сёння пара на Аляксандра Ляха. Многа я чуў пра яго палітычную і грамадскую дзейнасць ад жыхароў Белавежы. І мог бы напісаць аб ім ад свайго імя. Ды думаю, што цікавей расскажа ён сам. Вось што сказаў мне А. Лях, калі я папрасіў прадставіць гісторыю свайго жыцця:

— Што ж, — сароміцца мне свайго жыцця, думаю, не трэба. Нарадзіўся я ў Белавежы ў 1913 годзе, бацька быў земляробам. Жылося нам цяжка, зрэшты, не толькі нам. Вядома, якія тады былі часы. У школу пайшоў у 9 гадоў. Скончыў усяго 6 класаў. Працаваць — зарабляць пачаў яшчэ будучы школьнікам, у 12 гадоў. Найчасцей пілаваў драўніну служачым і яўрэям. Хапала на падручнікі і сшыткі. Як споўнілася мне 15 гадоў, пачаў я зарабляць больш. Даваў нават бацьку на падаткі.

У 1933 г. уступіў у КПЗБ. Наша ячэйка на Стачку налічвала каля 15 чалавек. Памятаю, што ў склад яе ўваходзілі Афанасій Байко, Аляксандр Зелянюк, Вольга Габец, Марыя і Ядвіга Гелінг, Павел Валкавыцкі, Мікалай Варнамін, Шлёма Касоўскі. Гэта тыя, што ўжо памерлі. Жывуць жа яшчэ Кірыл і Мікалай Шпаковічы, Кірыл Смактуновіч, Адам Бялко, Ян Бушко. Мне прызначылі абавязкі скарбніка і сувязнога. Дзейнасць сваю вёў я сярод лясных і тартачных рабочых. У час забастовак распаўсюджваў лістоўкі ў самой Белавежы і сумежных з пушчай вёсках, збіраў харчы для сем'яў забастоўшчыкаў.

У 1937 г. прызвалі мяне ў польскую армію, у 79 полк пяхоты ў Слоніме. Тут я сваёй дзейнасці не спыніў. 24.XII.1937 г. дастаў я святочны водпуск і пастанавіў наведаць бацькоў. Дамоў прыехаў назаўтра а 5 гадзіне раніцы. Не паспеў адпачыць, калі а 8 гадзіне з'явіла-

(Працяг на стар. 4)



Аляксандр Лях.

КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ З МІНСКА

Беларускія трактары

...Шырокая, урачыстая плошча, абрамаваная соснамі. У яе цэнтры на п'едэстале нязвыклы помнік — калясны трактар. Цячэ побач з ім густы чалавечы паток: ідзе рабочая змена мінскіх трактарабудаўнікоў. Яны ідуць побач застыўшага трактара, успрымаючы яго як прывычную дэталь плошчы. Не ўсе, зразумела. Бо ніколі не змогуць забыць тыя, хто працаваў над стварэннем першынца шматлікай сёння сям'і трактараў „Беларусь", таго радаснага дня, які стаў яго нараджэннем — 14 кастрычніка 1953 года.

Ці зможа моладзь, якая крочыць побач з ветэранамі, зразумець іх хваляванне, радасць, урачыстасць, якія царылі ў той дзень каля трактаразборачнага цэха нумар 2, з якога з рыкам імгненна выкаціў „МТЗ-2" з завадскім нумарам „1"? Ці не скажа ён так: „Ну і што ж, трактар сабралі..."

Можа сказаць. І не будуць папракаць ветэраны сваю змену за гэта паказное „ну і што ж"... Бо ведаюць: ганарыцца новае пакаленне трактарабудаўнікоў сваім славутым заводам. Ганарыцца тымі, хто 30 год назад прыйшоў сюды, на далёкую тады ўскраіну разбуранага горада, каб абудзіць ад векавой дрымоты сасновы бор, каб залажыць фундаменты першых цэхаў трактарнага.

Тыя, каму было 20, хто радаваўся першынцу беларускага трактарабудаўніцтва ў пачатку пяцідзесятых, цяжкавата парою і зразумець тую дзелавітую сур'ёзнасць, з якой моладзь успрымае факт, што сёння штодзённа завод пакідае больш трохсот дасканалых машын. Прывык рабочы сямідзесятых да лічбаў з некалькімі нулямі, звыкся з размахам, тэмпамі вытворчасці. Гэтым яго не здзівіш. Ён сам хоча здзіўляць. І здзіўляе.

Такіх тэмпаў, такога росту прадукцыйнасці працы, павышэння яе эфектыўнасці і якасці, якімі парадавалі мінчане краіну ў гады дзевятай пяцігодкі, яшчэ не знала гісторыя трактарабудаўніцтва. Некалькі гаворачых за сябе лічбаў: 14 лістапада 1975 года калектыў рапартаваў аб датэрміновым выкананні плана пяцігодкі па аб'ёму вытворчасці і росту прадукцыйнасці працы. Аб'ём вытворчасці павялічыўся на 44,4 працэнта, а планам была прадугледжана іншая лічба — 38,9 працэнта. Рост прадукцыйнасці працы склаў 141,9 працэнта. І зноў заданні апярэджаны амаль на 2,5 працэнта! Каля 64 мільёнаў рублёў звышпланавай прадукцыі, у тым ліку 6236 трактараў, на 14,5 мільёнаў рублёў запасных часцей. Так закончылі трактарабудаўнікі беларускай сталіцы дзевятую пяцігодку, пяцігодку, якая пачала лік другому мільёну трактараў.

Выконваючы пастаўленую партыяй і ўрадам задачу па ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі краіны і аснашчэнню яе новай тэхнікай, завод асвоіў вытворчасць новых высокапрадукцыйных трактараў — „МТЗ-80", прызнаных лепшымі трактарамі 1975 года. Датэрмінова, да заканчэння рэканструкцыі, прадпрыемства выйшла на сваю праектную магутнасць — 85 тысяч трактараў у год.

Як не ганарыцца калектыву гэтымі дасягненнямі! А канструктары, схіліўшыся над чарцяжамі, паганяюць: дзень сёнияшні — дзень учарашні. У цішы канструктарскіх бюро нараджаюцца мадэлі новых, яшчэ больш магутных, дасканалых машын. Ствараць змогуць, зразумела, толькі высокакваліфікаваныя спецыялісты, да тонкасці пазнаўшыя сваю прафесію. І трактарны вучыцца. На завадскіх курсах павышэння кваліфікацыі штогод займаюцца сотні інжынераў і тэхнікаў, папаўняючы свае веды па пытаннях эканомікі, кіравання, вытворчасцю, новай тэхнікі. Гэтым жа мэтам служыць дзейнічаючы ўжо многа год пры заводзе філіял інстытута павышэння кваліфікацыі спецыялістаў Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва СССР.

Той факт, што дзесяткі і сотні мінчан накіроўваліся некалі вучыцца рабіць трактары на падобныя прадпрыемствы, цяпер ужо стаў гісторыяй завода, Сёння яны самі сталі настаўнікамі і шчодра дзеляцца сваім вопытам з калегамі, што прыязджаюць да іх з усіх куткоў краіны. Едуць у Мінск удасканальваць сваё майстэрства і спецыялісты Польшчы, Венгрыі, Югаславіі, Балгарыі, ДРВ. Цеснай дружбай звязаны беларускія трактарабудаўнікі з таварышамі па працы Карлаўскага трактарнага завода ў Балгарыі, польскага „Урсуса".

Доўгія чыгуначныя саставы пачынаюць свой няблізкі шлях штодзённа з заводскай брамы. На платформах кантэйнеры з адрасамі соцень і тысяч населеных пунктаў краіны, шасцідзесяці краін зямнога шара.

Юрый Лабінскі

Фота В. Казлова



Трактары, гатовыя да адпраўкі карыстальнікам.



ІНТЭРВ'Ю Ў ПРЫСУТНАСЦІ АЎТАМАТА

Генерал Пінaчына сядзеў за рабочым сталом і любаваўся сваёй фатаграфіяй, якая ўпрыгожвала вокладку часопіса „Шпрынгер". Ён не ведаў чужой мовы, але з дапамогай слоўніка зразумеў значэнне тэксту пад здымкам, дзе яго абвяшчалі „смелым і справядлівым правадыром свайго народа". Тры гады назад генерал выбраў сябе прэзідэнтам краіны галасамі кулямётаў. Таму яго можна лічыць смелым і справядлівым правадыром народа, які ідзе па шляху, вызначанаму Адольфам Вялікім і Беньяміна Муска.

Рабочы стол у яго шыкоўным кабінеце некаторыя замежныя дыпламаты і ўладальнікі медных руднікоў лічаць сімвалам міру. Калі генерал садзіцца за свой рабочы стол, яго позірк у любы момант можа адпачыць на прыгожым аўтамаце, які ляжыць побач. На стале, прама ля левай рукі, стаіць цудоўна сплецены кошык для садавіны. Праўда, у кошыку не яблыкі, апельсіны і бананы, а дзесятак ручных гранат. На ўсякі выпадак.

Якую вялікую радасць і душэўнае задавальненне прынесла генералу вокладка вядомага часопіса! Ён быццам убачыў сябе з німбам на галаве і таму міжволі перахрысціўся. Яго малітва была перапынена з'яўленнем у кабінеце маладога палкоўніка, які аб'явіў:

— Ваша вялікасць абяцалі прыняць карэспандэнта часопіса „Шпрынгер". Дазвольце запрасіць?

— Вы праверылі яго кішэні?

— Так, ваша правасхадзіцельства. Мы таксама сфатаграфавалі яго тры разы і, акрамя таго, узялі адбіткі пальцаў.

— Добра. Запрасіце.

Праз дзве мінуты маладжавы журналіст атрымаў дазвол сесці насупраць генерала Пінaчына і пачаць інтэрв'ю.

— Што б вы хацелі даведацца? — спытаў генерал. — Я магу ўдзяліць вам дзесяць мінут.

— Вы вельмі ветлівы, пан генерал, — пачаў рэпарцёр. — Дазвольце спачатку спытаць пра ваша здароўе.

— Адчуваю сябе цудоўна, асабліва калі мае ворагі супакоены.

— Яны расстраляны або ў турме?

— Ні тое і не гэта. Я гуманіст і прыхільнік міру. Я не адабраю насілля.

— Некаторыя газеты сцвярджаюць, што ў краіне, якой вы кіруеце, пануе нейкі тэрор.

— Я не ведаю, што азначае гэта слова... Што б вы яшчэ хацелі даведацца?

— Гэтыя ж газеты пішуць, што ў вашай краіне праследуюць дэмакратычна настроеных людзей. Акрамя таго, некаторыя шкодныя газеты пастаянна сцвярджаюць, што ў турмах вашай краіны знаходзяцца тысячы невінаватых, якіх падвяргаюць катаванням.

— Гэта няпраўда! — выгукнуў генерал і схапіўся за аўтамат, які ляжаў на стале. — У маёй краіне невінаватых не саджаюць у турму. Хіба можна лічыць нявіннымі тых людзей, якія злачынна імкнуцца падзяліць усё пароўну і патрабуюць для народа тое, што народу не належыць? Хіба яны не яўныя злачынцы?

— Так, пан генерал. Яны ворагі дэмакратыі.

— Што б вы яшчэ хацелі даведацца?

— А ваш папярэднік? Ён таксама быў вінаваты?

— Калі вы маеце на ўвазе таго, які адабраў прыватныя землі і заводы ў лепшых грамадзян нашай краіны і замежных сяброў, то ён быў самым страшэнным злачынцам у яе гісторыі.

— Я таксама гэтак лічу, пан генерал. Але, нягледзячы на гэта, там-сям яшчэ ёсць некаторыя краіны, якія выступаюць у абарону вашага папярэдніка.

— Гэта не мае ніякага значэння, бо дэмакратыя, якую я прадстаўляю, належным чынам ацэнена многімі краінамі і іх урадамі. Мною кіруе адна думка: усеагульны мір на зямлі магчымы толькі пры тым, што бедныя застануцца беднымі, а багатыя — багатымі.

— Вялікае дзякуй, пане генерал, за гэта каштоўнае, хоць і кароткае інтэрв'ю. У канцы я хацеў бы задаць яшчэ адно пытанне.

— Пытайце!

— Пан генерал, якія яшчэ ў вас ёсць пажаданні?

— Я, не ўтойваючы, спадзяюся, што ў будучым годзе пры прысуджэнні Нобелеўскай прэміі міру ўспомняць пра мяне.

Марці Ларні,

фінскі пісьменнік



Sobota 16.X. 6.00 RTV Szk. Śred. Mat. 6.30 Biolog. 10.00 Dla szkół (kl. I—III) Czerw., żółte, ziel. 10.10 Film fab. 13.45 Tech. Rol. Fiz. 14.30 Upr. rośl. 15.45 Red. Szk. zap. 15.55 Pr. dnia. 16.00 Dla dzieci. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Śpiewaj razem z nami. 18.05 Prawdy i legendy przyrody — film dok. fr. 19.00 Dobr. 19.30 Dzien. 20.35 Podstępna gra — film fab. ang. 21.25 P. nożna. Portugalia — Polska. 23.15 „Winda" nr 5.

◇

Niedziela 17.X. 6.35 Tech. Rol. Fiz. 7.05 Upr. rośl. 7.35 Kurs Rol. 8.10 Now. w domu i zagr. 8.35 Przyp., radz. 8.45 Alarm przeciwpoż. 8.55 Sport. 9.00 TELERANEK. 10.20 Antena. 10.45 W starym kinie: Antoś czyli Antoni Fertner. 11.50 Bitwa pod Poitier — film dok. franc. Wielkie bitwy. 12.45 Dzien. 13.00 TYLKO W NIEDZIELĘ. 19.00 Wieczor. 19.30 Dzien. 20.40 TYLKO W NIEDZIELĘ — d.c.

◇

Poniedziałek 18.X. 12.45 RTV Szk. Śred. J. pol. 13.25 Tech. Rol. Hod. zwierz. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.45 Moskiewski taksówkarz — film fab. radz. 19.00 Dobr. 19.30 Dzien. 20.40 Teatr TV: J. Osborne — Nie do obrony. 22.15 Piknik — film rozr. ang. 22.45 Dzien.

◇

Wtorek 19.X. 9.00 Dla szkół (kl. V—VI) J. pol. Spotkanie z pisarzem. 10.00 Dla najmł. Czerw., żółte, ziel. 10.10 List i podwójne oświadczyny — film ser. ang. Wojna i pokój. 11.05 Dla szkół (kl. III lic.) J. pol. St. Wyspiański. Wesele. 12.00 (kl. VIII) Hist. Rządy parlament. w Polsce. 12.55 Dla szkół śred. Rodzina współcz. Na ślubnym kobiercu. 13.45 Tech. Rol. J. pol. 14.30 Chem. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.05 Studio Mł. 17.50 Licytacja. 19.00 Dobr. 19.30 Dzien. 20.40 Piękna Hipolita — film. fab. wł. 22.15 100 pytań do Romana Kłosowskiego. 23.00 Dzien.

◇

Środa 20.X. 6.00 Tech. Rol. J. pol. 6.30 Chem. 9.00 Dla szkół (kl. VII) Chem. Gaz życia. 10.00 Kurier z Warny — film fab. 12.00 Dla szkół (kl. VIII) Chem. 12.30 RTV Szk. Śred. Chem. 13.00 Tech. Rol. Upr. rośl. 13.30 P. nożna: Śląsk — Bohemians. 15.40 NURT. 16.10 Pr. dnia. 16.15 Los. Mał. Lot. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 16.55 P. nożna: Wisła — RDW Molenbeck. 19.00 Dobr. 19.30 Dzien. 20.40 Filmoteka Arcydzieł: Ucieczka skazańca — film fab. fr. 22.30 Sport. 23.40 Dzien.

◇

Czwartek 21.X. 6.00 RTV Szk. Śred. Chem. 6.30 Tech. Rol. Upr. rośl. 8.20 Ucieczka skazańca — film fab. 10.00 Dla szkół (kl. VI) Hist. Kultura polska w XV w. 11.05 (kl. VII) J. pol. Ignacy Krasicki. 13.45 Tech. Rol. Mat. 14.30 Hod. zwierz. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Przyp., radz. 17.05 Ekran z bratkiem. 18.10 Poligon. 18.35 Komicy niemego ekranu — film arch. USA. 19.00 Dobr. 19.30 Dzien. 20.40 Nić życia, nić śmierci — film USA (Columbo). 21.50 Pegaz. 22.35 Dzien.

◇

Piątek 22.X. 6.00 Tech. Rol. Mat. 6.30 Hod. zwierz. 9.00 Dla szkół. (kl. V) Geogr. Krajobraz przemysł. 10.00 Columbo — film USA. 11.05 Dla szkół (kl. VII) Wych. ob. Pomoc i współpraca. 12.00 (kl. VII) Geogr. Komunikacja w ZSRR. 12.45 RTV Szk. Śred. Mat. 13.25 Tech. Rol. Mech. rol. 15.50 NURT. 16.25 Pr. dnia. 16.30 Dzien. 16.40 Obiektyw. 17.00 Dla dzieci. 17.30 Dla młodych widzów: Skrzydła. 18.00 Informator Wyd. 18.25 Na kogo popadnie. 19.00 Dobr. 19.30 Dzien. 20.40 Jedno krótkie lato — film fab. ang. 22.20 X Y Z cz. I. 23.00 Dzien.




Piątek 15.X — 8.15 Film ser. 13.40 Film ser. 17.50 Film ser. 19.30 Operetka. 20.35 Film dok. 20.55 Tenis stoł. ZSRR—Węgry.

◇

Sobota 16.X — 8.30 Film ser. 10.35 Film fab. 12.00 Hokej. Spartak — Chimik. 17.00 P. nożna. Dynamo (Kijów) — Torpedo. 19.30 Koncert.

◇

Niedziela 17.X — 9.00 Koncert. 11.30 Film fab. 13.15 Pr. muz. 15.30 Piosenka — 76. 16.30 Klub film. 17.30 Spektakl TV. 19.30 Pr. muz. 20.40 Rugby: Czechosł. — ZSRR.



Białowieża Partita na instrument drewniany — pol. 19—20. Samotny detektyw — USA 21—22. Przyjaciele Eddiego — USA 23—24.

Czyże Był sobie glina — fr. Julka, Julia, Juleczka — NRD 20—24.

Dubicze Cerkiewne Zaklęte rewiry — pol. W drodze na Kasjopeję — radz. 20—24.

Gródek Trzej muszkieterowie — panam. 23—24.

Michałowo Pojedynek na szosie — USA 19—20. Rozwód — węg. 21—22. Trzej muszkieterowie — panam. 23—24.

Mielnik Synowie szeryfa — USA 20. Węgorz za 300 milionów — fr. 23—24.

Milejczyce Niewygodny kochanek — wł. 19—20. Mazepa — pol. 21—22. To jeszcze nie miłość — NRD 23—24.

Narew Ostatni wiosenny śnieg — wł. Przeznaczenie ma imię Kamila — czes. 20—24.

Narewka Podróż — wł. Znikąd do nikąd — pol. 20—24.

Nurzec Nieszczęście Alfreda — fr. 19—20. Drzewo bez korzeni — buł. 21—22. Przedmałżeńskie podboje — czes. 23—24.

Orla Poszukiwany — poszukiwana — pol. Pięć łatwych utworów — USA 20—24.

Rajsk Gdzie jest jubilat — jug. Deps — jug. 20—24.

B.Z.Graf. Zam. 2427 F-4.



Чаму ўцякаюць

Чуллівы суседзе,
Ціванюцкі Леўшук,
Узняў добру тэму
У сваім ты вершы.

Дык чаму ж уцякаюць
Маладыя з вёскі?
На гэта пытанне
Адказаць не проста.

Ці таму, што толькі
З світання да змроку
Да сёмага поту
Трэ' рабіць работу?

Ці таму, што горад
Маніць лёгкім хлебам,
Ці таму, што ў пору
Абед і вячэра?

Ці таму, што восем
Гадзін працы маюць,
А потым удосталь
Пасяпяць, пагуляюць?

Адно і другое!
Жыццё праўду родзіць.
Усё мае пору.
І не май за злое,

Што хлопцы й дзяўчаты
З сваіх родных вёсак
Йдуць у свет шырокі,
Як лісце ў восень.

Вучыліся ў школах,
Фах свой здабывалі,
Канікулы ў полі
Яны працавалі.

А калі пасталі,
Як кажуць, на ногі,
Тады пакідалі
Бацькоўскі парогі.

А калі ўжо выйшлі,
Як кажуць, у людзі...
За станком не лішні
Рукі іхні будуць.

Ой, не праўда, Леўшук,
Што цягнуць, як могуць.
Мо, свайго не меўшы,
Возьмуць сёе-тое.

Ты жывеш у вёсцы
І я жыву ў вёсцы...
Едуць у таксоўках
Гарадскія „босы“ —

Паночкі брухаты,
Сквапныя нажывы,
Цягаюць цялятак
І шынкі свіныя...

Лепей з рук у рукі,
Чым дзень марнаваці,
Ну, бо той пункт скупкі
За вёрстак пятнаццаць.

Вось і ўся тут штука
І простыя факты.
Сялян моцна мучаць
Лішні „адвакаты“.

Жыўшыя нядзелькай
Галубовы птушкі,
А не родны дзеці,
Што маюць навуку.

Каб не час суровы,
Ты б і сам вучыўся,
Не зламі за слова,
У горад прыжыўся б.

І быў бы вядомым,
Маеш, браце, голаў.
Прайшоў час суровы.
Жыццё цвёрдай школай...

У жніво, сам бачыш,
Вязалкі, камбайны,
Ну, а з цягам часу,
Хто знае, хто знае...

Мо таксама будзем
Лягчэй працаваці,
На поўныя грудзі
Песенькі спяваці?

Ці ж на тых камбайнах
Гарадскія едуць?
Не, сыны сялянскі,
Здабыўшыя веды.

Бо сёння ўручную,
Касой і віламі,
Слаба наваюеш,
Хіба, што з сынамі.

Адзін гараць будзе,
А другі касіці...
А потым за грудзі,
І брат брата біці.

За мяжу, за скібу,
За дурную зайздрасць,
За тую сялібу,
Дзе хатка старая.

Ты ж паэт з прыроды,
Адрозніць павінен
Зерне ядраное
Ад пустой мякіны.

Чаму ж „уцякаюць“
Маладыя з вёскі?
На гэта пытанне
Адказаць не проста.

Маланка

БЕЛАРУСІЯНА

Беларускі фальклор у „Песнях” К. У. Вуйціцкага

Калі ў 1876 г. сябры Казіміра Уладзіслава Вуйціцкага (1807-1879) на 50-годдзе яго літаратурнай і фалькларыстычнай дзейнасці паднеслі яму ў падарунку залатую табакерку, дык выдавец на юбілейнай вечарыне ўручыў яму экземпляр спецыяльнага найбольш поўнага і аднначасова па-мастацку аздобленага выдання яго ж *„Сказанняў, старажытных паданняў і аповесцяў люду польскага і Русі“*. У бягучым жа 1976 годзе, г.зн. у 150 гадавіну, вядомае вроцлаўскае выдавецтва „Асалінеум“ зрабіла фалькларыстам і наогул любіцелям славянскай вуснай народнай творчасці не менш каштоўны падарунак — фотатыпічнае выданне першадруку яго славутых *„Песенъ народа белахрабатаў, мазураў і Русі з-над Буга*)*, што пачалі выходзіць паасобнымі сшыткамі ў 1836 годзе.

Не месца тут на акрэсліванне значэння і ролі К. У. Вуйціцкага ў гісторыі польскай і славянскай фалькларыстыкі, бо на гэтую тэму існуе багатая літаратура, прыгадаем толькі вынесеную яго працам ацэнку Ю. Кжыжаноўскім: „Сённяшні фалькларыст адкрывае ў яго працах многа каштоўнага зерня, якое ён іменна паказаў, дабыўшы з сёння ўжо не існуючых крыніц“. („Слоўнік польскага фальклору“). Мы хочам звярнуць увагу чытача на тыя творы вуснай народнай творчасці з гэтага двухтомнага выдання „Песень“, якія непасрэдна датычаць беларускага фальклору Беласточчыны. А іх у гэтым выданні знаходзім шмат, і ўсе яны падзяляюцца на дзве асноўныя групы. Першую групу складаюць песні, апублікаваныя на беларускіх гаворках Падляшша, другую — песні на гаворках польскай мовы, у якіх знаходзім шмат элементаў, што выступаюць і ў польскіх і ў беларускіх песнях.

Да першай групы, г.зн. да ўласнабеларускіх песень Падляшша неабходна аднесці ў першым томе: цыкл купалаўскіх (*„Молодая молодіцу, выйді до нас на ўлыцу...“, „Малая ночка купальночка...“, „Ой, біжыт, біжыт красна дівчынка...“*), жніўныя (*„Нэ вылітай, сыва пэрэпэлко...“, „А наш эконом горшы собакі...“*), калядныя (*„Эй коляда, колядіцу...“, „Го-го-го-го! Козо нэбого...“*); у другім жа томе: дзіцячую (*„Ах, у клуны два каплуны...“*), любоўную (*„Чэрэз бор зэлэнэнькі...“*), рэкруцкія (*„В нэділеньку рано...“, „А в нэділеньку рано, поранэнъку...“*), а таксама звыш пяцідзесяці вясельных песень і прыпевак з ваколіцы Белай Падляшскай. Праўда, шмат у гэтых тэкстах транскрыпцыйных памылак, недакладнасцей, перакручаных слоў і іншых недахопаў, хоць К. У. Вуйціцкі і запэўніваў чытачоў, што *„дакладна захоўвае дыялект“* падляшскай Русі.

Цікава заўважыць, што шмат якія з гэтых твораў яшчэ і сёння жывуць на Падляшшы. Возьмем, для прыкладу, песню з т. зв. „паненскага“ ці „кавалерскага“ вечара напярэдадні вяселля, яе пачатак у К. У. Вуйціцкага такі: *„Ай! В городцу, в новосэнъкім // Розвіваетcя зіле; // у нашого Прокопка молодого // Зачынается вэсіле...“*. (т. II стар. 119), а ў выкананні народных спявачак з в. Плёскі гм. Бельск у мінулым, 1975 годзе: *„Розвіваецьсе, розвіваецьсе мятарута і зіеле, // зачынаецьсе, зачынаецьсе ў Гандюлі вэсіеле...“* („Ніва“ ад 25

(Працяг на стар. 5)

БЕЛАРУСКАЯ ПЕСНЯ-76



Дуэт з Бельска Людміла Грайко і Тамара Ільяшук (трэцяе месца ў катэгорыі сучаснай песні).
Фота Я. Цялушэцкага

З НАРОДНАЙ АБРАДНАСЦІ

Нараджэнне дзіцяці

Першай фазай абрадаў, звязаных з нараджэннем дзіцяці, з'яўляюцца роды. Калі абрады, звязаныя з іншымі стадыямі ў жыцці чалавека, хаця ў пэўнай ступені дайшлі да нас і па сённяшні дзень бытуюць у народзе, то абрадаў, звязаных з родамі, можна сказаць, амаль няма. Памерлі яны сваёй натуральнай смерцю. Абраднасць гэтая існавала датуль, пакуль роды адбываліся дома. Цяпер зусім інакш. А як гэта ўсё выглядала яшчэ гадоў дзесяць-пятнаццаць таму назад? Здаецца, і не так гэта даўно было, а ўжо нават і старэйшыя не памятаюць дакладна гэтых абрадаў...

Роды вымагалі павагі і цішыні. Гэта ж вялікая падзея. Адкрываецца жыццёвы шлях чалавека. Былі яны пазбаўлены ўсялякіх песень, але затое насычаны забабонамі і шаптаннямі, якія выконваліся прысутнымі, а найчасцей бабкай, якая была тут галоўнай персонай, бо ж пад яе вокам і апекай праходзілі роды. У час родаў у хаце заставаліся толькі жанчыны. Мужчыны выходзілі з хаты. Першым забабонным дзеяннем, якое выконвалі, было развязанне ўсіх вузлоў, што мела аблегчыць роды. А каб не дапусціць да нованароджанага злой сілы, запальвалі грамнічную свячу. Было і так, што роды прабягалі надта цяжка. Каб аблегчыць іх, наказвалі мужу, які ўвесь час хадзіў па панадворку, каб ехаў да папа, а той у сваю чаргу адчыняў у царкве царскія дзверы. Усё прайшло добра. Нарадзіўся чалавек. Чарга на завязанне пупавіны. Зразумела, усё гэта выконвае бабка. Праз нейкі час, калі пупавіна адпадзе, бацька хавае яе і толькі тады, як дзіця будзе мець гадоў пяць, дае яму яе развязаць. Ад гэтага залежыць будучыня дзіцяці. Калі развяжа — зможа адолець усе цяжкасці, якія падсуне яму жыццё, будзе мудрым, калі не — будзе чалавекам тупаватым. Цяжка яму будзе ў жыцці. Але вернемся да нараджэння. Вось ужо выкупалі новanароджанае. І тады, калі гэта дзяўчына, то абвіваюць яе нагавіцамі, а калі хлопец — то фартухом, або спадніцай. Дзякуючы гэтаму забабону, за дзяўчынай, калі вырасце, будуць аглядацца хлопцы, а за хлопцам будуць бегаць дзяўчаты. Адначасова давалі ў рукі нейкую прыладу, якая была найбольш каштоўнай і папулярнай у жыцці, найчасцей быў гэта алоўак. Сімвалізаваў ён мудрасць, пашану і „лёгкі хлеб“. Калі ў вёсцы быў чалавек, які ўмеў варажыць, ішлі да яго і прасілі, каб прадказаў лёс дзіцячы. У дзень нараджэння абсалютна нічога не пазычалі.


М. Шаховіч

УЗВІЦЦА ПТУШКАЙ...

У Супраслі кожны пакажа вам дарогу да яго. Жыве ён на першым паверсе вялікага драўлянага дома па вул. Касцюшкі. Сваю майстэрню мае ў даволі вялікім гасцінным пакоі, які ўвесь выпаўнены пахам алейнай фарбы. Францішка Шылэйку застаем ля мальберта, ён за сваім любімым заняткам — малюе восеньскі пейзаж. У пакоі многа карцін, рэпрадукцый славутых карцін Леанарда да Вінчы: „Мона Ліза“, „Леда з лебедзем“, „Мадонна сярод скал“, „Спячая Венера“, „Апошняя вячэра“ і іншыя.

— Жывапісам я зацікавіўся яшчэ ў Вільні, — расказвае Ф. Шылэйка. — Я любіў наглядаць за зменнай прыгажосцю навакольнай прыроды, каб пасля яе маляваць. Маляваць вучыўся я і ў мароза, які ўпрыгожваў шыбы вакон кветкамі. Палюбіў таксама тэхніку, бо яна мае штосьці супольнае з мастацтвам. У маладыя гады мне давялося лётаць на хуткіх самалётах (у вайну я быў салдатам), і цяпер мару яшчэ аб палётах. Таму задумаў я збудаваць самалёт. Будзе ён шасціметровай даўжыні, звыш двухметровай вышыні, вагою не менш трохсот кілаграмаў. На ім узнімуся на вышыню 4000 метраў і палячу са скорасцю не менш 200 кіламетраў. Ужо маю амаль усё неабходнае, цэлую канструкцыю верталёта — магутны рухавік, руль кіравання, прапелеры і іншыя дэталі раздабыў у розных вытворцаў ва ўсёй краіне. Каб мець грошы на іх пакупку, я прадаў шмат сваіх карцін. Сам верталёт займае паддашша ў драўлянай шопе, якая напамінае галубятню. Думаю, што навесну прanясуся я сваім стальным птахам над дахамі Супрасля. Вельмі ж хацелася б паглядзець на нашую прыгожую беластоцкую зямлю з птушынага палёту. Невядома, адкуль бярэцца ў чалавека неўтаймаваная цяга да таго, каб адарвацца ад зямлі ды ўзляцець па-над ёю. Як у мітычнага Ікара... Свой выпрабавальны палёт планую пачаць на адной з супрасльскіх вуліц або ў выпадку дрэннага надвор'я на лузе, за мястэчкам. Буду ляцець уздоўж ракі Супраслі. Яна паслужыць мне арыенцірам. Мой пачын, несумненна, засее непакой у маладых юнакоў, якім справа лётаючых мадэляў неабыякавая. Яны, пэўна, пачнуць займацца канструяваннем іх у большым маштабе. Колькі ж ёсць такіх, якія так, як некалі я, марацъ, аб палёце...

Тэкст і фота **Я. Цялушэцкага**



Францішак Шылэйка за рулём кіравання верталёта.


БАГАЦЕЕ СПУЛДЗЕЛЬНЯ

Пачатак на стар. 1


У апошнія гады на спулдзельчым панадворку шырокім фронтам разгарнулася будаўніцтва інвентара.

— Стараемся не адставаць, — сцвярджае кіраўнік Кусачук, — ад галоўных напрамкаў палітыкі нашай партыі. Таму рашылі мы разбудаваць базу для гадоўлі свіней. Корм маем уласны, на дапамогу дзяржавы азірацца не вымушаны, дык і ўмовы дзеля гэтага ў нас спрыяльныя.

— Ідзем сярод новых будынкаў, вакол якіх мітусяцца яшчэ рабочыя Бельскага прадпрыемства вясковага будаўніцтва.



За старой хлеўняй у гэтым годзе паявіўся вялізны новы будынак для гадоўлі свінаматак і парасят. Тут спулдзельцы ўжо вядуць адкорм 600 кармнікаў за адзін раз.



Сацыяльна-адміністрацыйны будынак, у якім будзе святліца, два памяшканні і бюро спулдзельні. Побач склад на збожжа і мінеральныя ўгнаенні.

— Свінагадоўля, — паясняе кіраўнік, — будзе ў нас наладжана камплектна ў закрытым кругу: ад уласных свінаматак і парасят аж да паўнавартасных кормнікаў, прызначаных на продаж.

— Ці таксама займаецеся гадоўляй кароў?

— Так, аднак у абмежаваных размерах, бо дзеля гэтага не маем спрыяльных умоў, не хапае нам пасбішчаў. Цяпер у нас 100 з лішнім кароў, пераважна маладняку, які мы бярэм на адкорм, а пасля прадаем на мяса.

З пабыўкі ў спулдзельні прадукцыйнай у Вульцы Нурэцкай прывёз я некалькі здымкаў, якія, мяркую, дадуць чытачам лепшае ўяўленне аб тым, што там зараз дзеецца, чым самы падрабязны расказ. Яшчэ толькі дадамо, што вартасць усіх спулдзельчых будоўляў дасягнула 30 мільёнаў злотых. Значыць, спулдзельня шмат пабагацела.

(вр)

Фота аўтара

МАЕ РОЗДУМЫ

ВОКАМ І СЭРЦАМ ЧЫТАЧА

У сувязі з VIII з'ездам БГКТ многа пра яго пішацца на старонках „Нівы". Не скажу, што заўсёды добра, часам трэба глянуць не толькі на дасягненні, але ацаніць і недахопы. Праўду сказаўшы, дык БГКТ на вёсцы мала дзейнічае. Ад з'езду да з'езду няма таго, каб хто прыехаў у вёску, пагаварыў з тутэйшымі бэгэкатоўцамі. Сход з удзелам госця адбыўся толькі перад з'ездам. І тут яшчэ іншая справа. З двух гурткоў выбіралі аднаго дэлегата і таму дакладчык прыязджаў толькі ў адзін гурток — у большы.

Так было і ў Галадах. Прыехаў да нас заслужаны дзеяч БГКТ Васіль Антыпюк з Бельска. Доўга гаварылі члены галадоўскага гуртка з мілым госцем. Аб чым? Аб розных нашых справах. І вечар зляцеў хутка. Выбралі дэлегата на з'езд. Некалькі асоб, у тым ліку і я, уступілі ў арганізацыю. У справаздачы напісалі пра тое, каб арганізаваць у вёсцы сустрэчу з нейкім беларускім паэтам ці пісьменнікам, каб прывезці беларускі фільм. І ўжо столькі часу прайшло, а пра ўсё тое не чуваць. А нам жа хочацца, каб наш гурток жыў і развіваўся.

Ад таго часу мы самі арганізавалі некалькі сходаў. На адзін з іх аж з Бельска прывезлі гарманіста — паспявалі і пагутарылі. Было вельмі прыемна. Але нам не толькі хочацца, каб самім пасядзець. Мы хочам, каб усе жыхары вёскі ўдзельнічалі ў тым, што робіць гурток.

Такія гуртkоўскія вечары бываюць вельмі цікавымі. Вось, калі арганізавалі ў мінулым годзе сустрэчу з Аляксандрам Амільяновічам, дык сабралася многа, многа людзей. Усе з захапленнем слухалі яго апавяданне. Была жывая дыскусія. Усе, хто прысутнічаў на вечары, купілі яго кніжкі з подпісам. Так магло б быць і на сустрэчы з Алесем Баршчэўскім ці з кім іншым.

Валянцін Анапюк

(Працяг са стар. 1)

Незвычайная біяграфія звычайнага чалавека

ся гранатовая паліцыя. Зрабіла рэвізію, шукаючы камуністычных лістовак і зброі. Не знайшоўшы нічога, арыштавалі мяне і даставілі на пастарунак. У гэты дзень арыштавалі амаль усю нашу ячэйку.

Як потым ужо мы даведаліся, выдаў нас Мікалай Мышкевіч, які потым, у момант уваходу ў 1939 г. на гэтую тэрыторыю савецкіх войск, змыўся і слух па ім загінуў.

26.XII. скавалі нас усіх у кайданы і адвезлі ў следчае аддзяленне ў Бельску Падляшскім на допыт. Нягледзячы на мучэнні (нас калолі іголкай за пазногці, саджалі пальцы між дзвярэй, саджалі на жалезнае крэсла і падключалі ток), ніхто да нічога не прызнаўся і нікога не выдаў. Следства закончылі ўначы. Нас адпусцілі ды кожны з маіх таварышаў павінен быў 3 разы ў тыдзень рапартавацца на белавежскім пастарунку паліцыі. Я вярнуўся ў полк. Неўзабаве ў маёй роце была праведзена рэвізія — шукалі камуністычных лістовак. Нічога не знайшлі. Пасля рэвізіі паклікаў мяне камандзір палка, наклаў мне разоў па твары, зняважыў і выкінуў за дзверы. Ад гэтага часу стаў я палкавым падмятальшчыкам. У канцы мая 1938 г. прыслалі мне акт абвінавачвання па артыкулу 97/93 і павестку ў акруговы суд у Беластоку на выязной сесіі ў Белавежы. Судзілі мяне 9.VI.38 г. Прыгавор для мяне казаў: 2 гады турмы і 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. 2 гады турмы даравалі па амністыі, рэшта засталася. З арміі вызвалілі 18.IX.1938 г.

Жылося мне вельмі цяжка. Не мог атрымаць ніякай пастаяннай працы. Праследавала гранатовая паліцыя. І так было да прыбыцця ў 1939 г. на тэрыторыю Беласточчыны Савецкай Арміі. У 1940 г. выбралі мяне дэпутатам сельсавета ў Белавежы. Потым накіравалі на курс агітатараў у Бельск. Пасля заканчэння двухмесячных курсаў камандзіравалі ў лугавую гаспадарку Нікар для правядзення агітацыйнай працы сярод рабочых. Быў я тут да таго дня, калі немцы напалі ў 1941 г. на Савецкі Саюз. Праз некалькі дзён гестапа арыштоўвае мяне і маіх таварышаў. Звязалі нас, укінулі ў аўтамашыну і адвезлі ў Беласток у штаб на вуліцы Варшаўскай. 2 тыдні катавалі. Пасля адпусцілі мяне дамоў. У ліпені выселілі сумесна з бацькамі ў ваколіцу Пружаны, у сяло Аранчыцы. Гітлераўцы не дазволілі нічога з сабой узяць. Гаспадарку бацькі канфіскавалі. У Аранчыцах наняліся мы парабкамі ў нямецкі маёнтак. Іншага спосабу пражыць не было. Няраз даводзілася атрымаць нагайкай па плячах ад уладальніка, хаця працавалі ад раніцы да ночы. Таму з небывалай радасцю прывіталі мы вызваленне. 30.VIII. 1944 г. мабілізуюся ў Савецкую Армію. Пасля капітуляцыі немцаў мяне дэмабілізуюць. Вяртаюся дамоў. Бацькі былі ў Савецкім Саюзе, два браты загінулі на фронце. Цяжкі быў пачатак. Гаспадарка бацькі была разбурана. У снежні 1945 г. уступаю ў рады ППР. У наступным годзе жанюся. Працую земляробам, а ад 1950 г. наглядчыкам-зубраводам у Белавежскім нацыянальным парку. У 1952 г. выбіраюць мяне грамадскім інспектарам працы. Гэтую функцыю выконваю 2 тэрміны паўнамоцтва. Сакратаром ПАП ПАРП пры БНП з'яўляюся ў гадах 1962-64, 1968-70, а членам камітэта ад 1970 г. Функцыю раднага займаю ад 1969 г. да 1973 г. У кастрычніку 1975 г. перайшоў я на партыйную пенсію.

І вось мая біяграфія. Жыццё маё не было выслана ружамі. Ды я нічога не шкадую.

П. Байко

Фота аўтара



Жыхары Відава, прадчуваючы набліжэнне восеньскіх дажджоў, а таксама з думкай аб веснавых растопах, кінуліся ў пошукі рыбацкіх ботаў. Трэба ж неяк будзе ў горад дабірацца.

(мша)



НАШАНІЎСКАЯ ПАРА

АЛЬБЕРТ ПАЎЛОВІЧ — ЧАСТКА XVI

Гумарыстычная плынь. Сацыяльныя адносіны. Ахарактарызуем вершы, у якіх паказаны камічныя моманты адносін паміж сялянамі і інтэлігенцыяй. Гэта праблема праяўляецца ў творах „Няўмекі і лекі", „Рэцэпт", „У фельчара", „Нейтралітэт", „Шчодрая ахвяра". У трох першых творах паказаны розныя камплікацыі паміж сялянамі і прадстаўнікамі медыцыны, два апошнія датычаць сялян і чыноўнікаў.

Верш „Няўмекі і лекі", хаця і ўтрыманы ў духу аб'ектывістычнай люстрацыі здарэнняў, па сутнасці вастрыём выступаючага ў ім камізму накіраваны супраць сялянства. Праўдападобна, твор гэты, як і многія іншыя вершы Паўловіча, быў расшыранай вершаванай версіяй панскіх анекдотаў аб наіўнасці селяніна. У творы выступаюць элементы гумару праўдападобнага, але ёсць у ім і гумар неверагодны. Змест верша зводзіцца да неўласцівай рэалізацыі сялянскай сям'ёй парадаў фельчара. Да рэальных трэба аднесці апісанні, паводле якіх хворы селянін амаль адразу выпіў прызначанае на многа дзён лякарства. Такое здарэнне ў даўняй вёсцы зусім магчымае. Цяжка, аднак, паверыць, што жанчына, атрымаўшы ад фельчара рэцэпт і пачуўшы раду „прыкладайце гэта", прыклейвае рэцэпт свайму мужу на хворае месца. Маем тут дачыненне з выразнай, магчыма, нават фальшывай гіперболікай. Якраз такога роду гумарыстычныя апавяданні аб наіўнасці селяніна бытавалі ў панскім або чыноўніцкім асяроддзі і, мабыць, Паўловіч выкарыстаў адзін з іх у сваім вершы.

Трэба падкрэсліць, што з вонкавага, фармальнага боку верш „Няўмекі і лекі" ясны і дынамічны і, несумненна, смешны, незалежна ад таго, як аднясемся да грамадскай вымовы твора.

Верш „Рэцэпт", бадай, таксама вядзе свой радавод з анекдота. Змест яго такі. Лекар наведаў хворую сялянку і прыпісаў ёй лякарства. У сувязі з тым, што не меў пры сабе паперы, запіс зрабіў на дзвярах. Селянін валачэ рэцэптдзверы ў аптэку. Вастрыё камізму накіравана тут у не меншай ступені супроць лекара, чым селяніна. Можна спрачацца, хто больш смешны: селянін, які цягне ў аптэку дзверы, ці лекар, які на дзвярах выпісвае рэцэпты. Стылістыка верша „Рэцэпт" адзначаецца выключнай лёгкасцю і камунікатыўнасцю. Вось фрагмент твора:

Зазваў доктара да жонкі,
Той яе абслухаў,
Не жалеў я — за фатыгу
Пяць рублёў убухаў!
Доктар прыпісаў мікстуру
І глытаць таблеткі...
Не было шматка паперы,
Дык быў добры гэткі,
Што спісаў рэцэпт на дзверы,
Не зрабіў папрэку...
Памажы з кручкоў зняць дзверы,
Занясу ў аптэку.

Усё ў форме верша лагічнае. Выказванне селяніна ў фармальным сэнсе праўдападобнае за выключэннем аднаго слова — „мікстура". Гэтае слова селянін у часах Паўловіча, бадай, калі б нават і пачуў яго, то не запомніў бы і не быў бы ў стане вымавіць. Гэта, аднак, толькі нязначная дэталь.

Апошні верш з медыцынскага цыкла мае загаловак „У фельчара".

Твор гэты — хаця і няма ў ім адаўтарскіх мараляў, выразна накіраваны супраць недапечаных медыкаў, якія, не маючы элементарных медыцынскіх ведаў, адным спосабам лячылі ўсе хваробы. У творы апавядае аўтар аб візіце дзвюх жанчын у фельчара. Адна з гэтых жанчын старая, мае хворую галаву; у другой, маладой, хворы жывот. Фельчар адну лечыць рыцынай і другую лечыць рыцынай. Калі адна з жанчын выяўляе здзіўленне: чаму розныя хваробы лечацца адным і тым жа спосабам, фельчар ужывае капітальны аргумент — адно лякарства, бо хворыя з адной вёскі. Несумненна, смешна.

Мабыць, і гэты верш з'яўляецца апрацоўкай анекдота. Па сутнасці ўсе з'явы грамадскага жыцця, прадстаўленыя ў „медыцынскім" цыкле, мелі сумны характар. Стан здароўя беларускай вёскі і спосабы яе лячэння былі безнадзейныя. Многія беларускія пісьменнікі пісалі аб гэтых справах часта ў драматычным, а нават трагічным аспекце. Паўловіч глянуў на гэтыя справы праз камічную прызму. Якія-колечы прэтэнзіі да пісьменніка былі б тут не абаснаваны.

(Працяг са стар. 3)

Беларускі фальклор у „Песнях“ К. У. Вуйціцкага

красавіка 1976 г.). Ці з ад'езду маладых да вянцу ў К. У. Вуйціцкага знаходзім: *„Нэма ксёндза дома, // Пойіхал до Львова, // Ключыків куповаты // Цэрковку одмыкаты, // Двойі людый звіньчаты“* (т. II, стар. 152), а пятнаццаць год таму ў ваколіцах Бельска спявалі: *„Хоть едтэ, нэ едтэ — // Нэма попа дома, // Поехав до Львова, // Забыв ключоў взяті — // Цэрковую одмыкаті“* („Беларускі каляндар на 1964 год“, стар. 112). Або з дажыначных, у К. У. Вуйціцкага: *„Нэ жалуй егомосць свыго зрэбця, // Пошлій по водку, хот бы до Крулевця“* (т. II, стар. 209), а ў вёсцы Пясчанікі каля Гарадка ў 1959 годзе шасцідзесяцігадовая А. Грыцук спявала: *„Ні жалуй, пане, сіўца-жаробца, // Едзь па гарэлку аж да Крулеўца“*. („Беларускі каляндар на 1961 год“, стар. 209). Такія прыклады можна было б прыводзіць болей. Усе яны сведчаць, па-першае, аб незвычайнай даўгавечнасці некаторых народных песень, а, па-другое, аб тым, што К. У. Вуйціцкі, сам пражываючы на Падляшшы, унёс вялікі ўклад у запісы беларускай народнай гаворкі і народнай песні ў гэтым краі.

У абодвух тамах выдання знаходзім многа такіх песень на польскай мове, эквівалент або блізкі варыянт якіх яшчэ і ў нашыя дні спяваюць на беларускіх гаворках Падляшша. У першую чаргу варта прыгадаць папулярную песню аб магнаце з Канева і прыгожай бандароўне, якую знаходзім у *„Песнях“* К. У. Вуйціцкага (т. I, стар. 30-31). Гэтая гістарычная песня ў розных варыянтах аднатавана амаль усімі збіральнікамі беларускага і ўкраінскага фальклору, яна бытуе і ў наш час у вёсцы Гнецюкі каля Заблудава на Беласточчыне („Ніва“ ад 14 сакавіка 1976 г.), а вяршыняй яе мастацкага пераўвасаблення з'яўляецца вядомая паэма Я. Купалы *„Бандароўна“*. Ці возьмем песню з дзіцячага фальклору аб смерці камара. Яе польскі варыянт К. У. Вуйціцкі аднатоўвае на Мазоўшы (т. II, стар. 269). У беларускай фалькларыстыцы яна вядома ў некалькі варыянтах, і перш за ўсё са зборніка А. Грыневіча і А. Зязюлі *„Беларускія песні з нотамі“*, т. II, Пецярбург 1912. Пад таленавітым пяром нашага выдатнага лірыка М. Багдановіча янаператварылася ў абаяльную паэму *„Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык“*. Цікава і тое, што польская песня *„Панна і павы“* („ Песні“, т. I, стар. 170-171) змяшчае ў сабе элементы з дзвюх распаўсюджаных амаль па ўсім беларускім этнічным абшары народных песень *„Канапелька“ і „Пава“*, у тым і на Беласточчыне („Ніва“ ад 15.X.1972 і 5.I.75). Гэтую песню К. У. Вуйціцкі аднатаваў каля Лэнчыцы. Такіх прыкладаў ёсць у гэтым выданні значна болей. Яны красамоўна сведчаць пра тое, што ў беларускім і польскім фальклоры ёсць вельмі многа супольнага і ўзаемна запазычанага. Гэтая аграмадная тэма ўсё яшчэ чакае свайго даследчыка. Заўважым, што ўзноўленая кніга К. У. Вуйціцкага „Песні народа белахрабатаў, мазураў і Русі з-над Буга“ — гэта адна з важкіх прадпасылак да ўзняцця гэтага шматабяцаючага, займальнага і патрэбнага для культуры абодвух нашых народаў даследавання.

Мікалай Гайдук

---

*) Kazimierz Władysław Wójcicki, Pieśni ludu Białochrobotów, Mazurów i Rusi znad Bugu, Ossolineum 1976.

Ад Соф'і Скепка, 1934 года нараджэння, вёска Баб'я Гара гм. Нараўка, запісаў у ліпені 1976 г. М. Гайдук. Нотная транскрыпцыя з магнетафоннай стужкі — Людмілы Панько.

Ці ведаеце, што...

...на Беласточчыне бульба займае больш 20% у структуры ўсіх сельскагаспадарчых раслін.

...ў Беластоцкім ваяводстве ёсць 46 тыс. га ПФЗ-аўскіх зямельных угоддзяў, а ў 1976-1980 гадах яны павялічацца на 45 тыс. га.

...карова, якая дае 12 літраў малака, на працягу сутак выпівае 30-40 літраў вады. (ця)

ПА ГІСТАРЫЧНЫХ МЯСЦІНАХ

ПЕРАЦЁСЫ


Вакол, на выжары, агромністыя яловыя пні, а з пакручастых баразён нядаўняй пасадкі ў неба цягнецца дружны сасновы маладняк. Колькі крокаў унізе ўецца сярод вываратняў ды распырскваецца жывым серабром па пясчаным дне лясная рачулка Перацёска. Магіла абгароджана роўненькім габляваным шчыкецікам, над ёю ж высіцца крыж.

З дзеда-прадзеда старажыл вёскі Крулёвае Стойла, што раскінулася паасобнымі хацінамі пад лесам, звыш сямідзесяцігадовы ўжо Уладзіслаў Сянкевіч доўга глядзіць сваімі выбляклымі ад сонца і ўбачанага ў жыцці вачыма на ірдзістую зелень лугоў, якія праціраюцца над Супраслю, і згадвае:

— Яшчэ мой дзедка, святой памяці Ян Сянкевіч, што аб'ездчыкам у гэтых лясах быў якраз у тыя гарачыя часы, расказваў, бывала, зімовымі вечарамі. Яго аднойчы напрадвесні 1863 года казакі ў лесе злавілі і, падазраючы, што ён паўстанцам прыхільны, харч ды весткі ім у лясную глухамань дастаўляе, так нагайкамі ссеклі, што праляжаў ён у лесе два дні і дзве ночы ні жывы, ні мёртвы. А калі ачухаўся і дадому неяк прывалокся, тады ў лазні ў Гарадку ад тых пабояў лекаваўся бярозавай мяцёлкай, над парай разагрэўшыся. І што вы на тое? Маўляў, пабоі тыя, бы рукой, зняло. Дык вось ён і казаў, што паўстанчаскі атрад ішоў недзе ад Пілатоўшчыны. Скрунуў у лясное ўрочышча Перацёсы, каб перадыхнуць. Меў з сабою абоз, а ў ім здрадніка нейкага, што ўсю дарогу трусіў саломаю. На след напалі казакі. Акружылі знясіленых і паснуўшых паўстанцаў і выцялі іх у пень. Толькі некалькім асобам удалося скрыцца ў лясной гушчэчы і выйсці адтуль жывымі. Ляглі, ведаеце, сорак тры юнакі і мужчыны, бы дубы. З родзічаў мае маткі, што з Казлоўскіх паходзіла, таксама двое загінула, а адзін уцёк. На брацкай магіле царскі стражнік нават крыж паставіць забараніў. Але чыясьці спагадлівая рука навокал магілы пазрэзвала вершаліны гонкіх елак, а на камлях зацёсы глыбокія пакінула. І кажуць: елак тых абезгалоўленых было сорак тры і сорак тры зацёсы на камлях. Плакалі акалечаныя дрэвы ды смалістымі слёзамі раны свае зацягвалі. Але ж тая невядомая рука жывіцу на ранах падпаліла — знак зарубцаваць не дазволіла. Спачатку дзедка, потым мой бацька, а цяпер і я штогод у Дзень задушны наведваем магілку. То плоцік папраўім, каб лясны звер там не таптаўся, то крыж новы паставім, каб знак аб месцы пахавання быў, то з лісця ды кастрыцы магільны копчык агорнем, каб след не загубіўся...

І выбляклыя вочы Уладзіслава Сянкевіча вандруюць недзе туды, па-над вершалінамі Букштэльскай пушчы, над усімі гэтымі яе таямнічымі назвамі ўрочышчаў Стромы Груд, Услі, Выжары, Перакал, Забіты, каб затрымацца якраз на тым кірунку, дзе ў якіх шасці-сямі вярстах, на пагорку, на ўзбярэжжы лясной рачулкі Перацёскі, у муле і твані, тутэйшы ляснік Клюковіч знайшоў старадаўнюю стрэльбу-шратоўку. Відаць, яна належала аднаму з тых, што ўзняліся на Вялікі Пачын і палеглі ў гэтай лясной глушы.

Мікалай Гайдук
Фота аўтара





ЯК ЗНАЙСЦІ СПОСАБ НА „СПОСАБ“.

Кажуць, што гайнаўская Рамесніцкая спулдзельня featured рознага рамясла (так хітра называецца ўстанова, якая партачыць рамонты) прыдумала новы спосаб замыкання дзвярэй. Усе ведаюць пра клопаты рамеснікаў з дзвярнымі замкамі: то замок не пасуе да дзвярэй, то дзверы да замка не падыходзяць. Дык вось у такой складанай сітуацыі спулдзельня запрапанавала новы „спосаб“. Хопіць толькі размантаваць замок і клямку, тады застанецца ў дзвярах вялікая круглая дзірка. Усадзіўшы ў яе палец, можна лёгка адчыняць дзверы, тым больш, што ніякімі зачэпкамі яны за сцяну не трымаюцца. І проста, і танна, як кажуць людзі.

Такія вось дзверы можна ўбачыць у крывецкай школе. Яны вядуць ва ўсе класы. І нічога, дзеці прызвычаіліся. А некаторым нават падабаецца гэта, асабліва тады, калі хто спозніцца на ўрок. Не трэба і ў класе быць, каб чуць і бачыць, што там робіцца. Толькі вось настаўнікі занадта традыцыйныя, не падабаецца ім новы „спосаб“: не могуць прызвычаіцца да такіх дзвярэй, нібы гэта дражніць іх эстэтычную ўражлівасць...

Частку дзвярэй рамесніцкая спулдзельня наогул зняла і павезла ў Гайнаўку. Відаць, гэта будзе яшчэ нейкі навейшы „спосаб“ замыкання дзвярэй...

Рамонт школы ў Крыўцы павінен быў закончыцца яшчэ ў мінулым годзе. Але і да пачатку гэтага навучальнага года спулдзельня паспела толькі перакрыць дах, памаляваць сцены і прыслаць пагрозу, што за незаплачаны рамонт падае школу на суд арбітражу.

Пад канец жніўня памалявалі сцены, а з першым дажджом у верасні аказалася, што дах працякае, як ніколі да гэтага часу, а сцены адразу „ўпрыгожыліся“ зацёкамі.

Спулдзельня аказалася таксама вялікім спецыялістам па школьных туалетах. Рабіла іх занава ў школьным будынку. Кожная кабіна ў туалеце аддзелена такім тоўстым мурам, што ніякім дынамітам яго не ссунеш з месца, а пра дзверы да кабін (ох, тыя няшчасныя дзверы!) зноў забыліся. Хоць ты фартушком прыкрывай сарамлівае месца! Цікава, як бы сябе адчуваў у гэтай кабіне сам начальнік, які такі праект зацвярджаў?

Бегаў-бегаў дырэктар крывецкай школы ў Гайнаўку, абіваў парогі рамесніцкай спулдзельні... Але нічога, апрача пагрозы арбітражам, не выбегаў.

Прыйшлі ў верасні дзеці ў школу, паглядзелі на сваю знявечаную „буду“ і плакаць ім захацелася. „Дзядзечкі, — ледзь не крычалі яны, — што ж гэта вы робіце? Мы ж так стараліся, каб наша школа была прыгожая, а вы? Што ж вы з яе зрабілі?“

І няхай тут дырэктар ці хто яшчэ спрабуе выхоўваць дзяцей так, каб былі сумленнымі, стараннымі працаўнікамі! Не-е, такая спулдзельня, як гайнаўская рамесніцкая, да гэтага не дапусціць. Нездарма ж яны на сваю неахайнасць прыдумваюць усё новыя і новыя „спосабы“! (яч)

Кансультацыя юрыста

: Л. працуе сторажам. Атрымоўвае 7 зл за /₀ прэміі. У мінулым годзе за старажаванне бо свята плацілі падвойна, а за звышуроч- плацілі дадатак 50 і 100⁰/₀. Працуе па сістэме старажавання і 24 гадзіны свабодныя. Ці абаваць дадаткаў за працу ў нядзелі і свя- урочную работу?

д 1 студзеня 1976 года абавязвае сторажаў а асабліва распараджэнне Рады Міністраў ада 1974 г. у справе часу працы і прынцы- оджання за звышурочную працу работнікаў, пры пільнаванні. Паводле гэтага распарад- працы стоража ўстаноўлены на 12 гадзін у адзін у тыдзень. Да гэтага часу абавязвала норма працы 72 гадзіны. У новым урэгуля- значэння, ці праца прыпадае ў нядзелю або так за звышурочную працу прыслугоўвае , калі б праца працягвалася звыш 12 гадзін звыш 56 гадзін у тыдзень. Тыднёвае разлі- працы бярэцца за перыяд трох тыдняў. З гэ- е, што зарплата выплачваецца згодна з за-



Дарагое Сэрцайка, мне 20 год, сама я з вёскі, але закончыла школу і цяпер жыву і працую ў горадзе. Яшчэ калі была вучаніцай, сябравала з хлопцам з нашай вёскі. Але не кахала яго, не лічыла яго нарачоным і не думала з ім звязваць свайго жыцця, тым больш, што ён працуе на гаспадарцы, а я ніколі не думала вяртацца на вёску. Хадзіла, бо не было іншага. А ён мяне кахаў, і спадзяваўся, што выйду за яго замуж. Але калі я пайшла працаваць у горад і даўжэйшы час не паяўлялася на вёсцы, дык ён страціў надзею і ажаніўся. Ажаніўся, бо ўжо і час, і рук да працы трэба. Так сказаў мне, калі я прыехала ў вёску і мы вечарам спатkаліся. Прасіў, каб надалей спатыкацца. Спатыкаліся. Урэшце даведалася аб гэтым яго жонка, ну і, вядома, пайшло па ўсёй вёсцы. Аб гэтым сказала мне мая мама, якая ў гэтай справе да мяне прыехала. Цяпер мне сорамна, ды і страшна крыху ехаць у вёску. Парай, Сэрцайка, што рабіць?

Міра з Беластока

Міра! На жаль, ты не без віны. Трэба было сказаць, што ён табе толькі сябра. А так ён меў надзею, цябе кахаў і спадзяваўся на цябе. Ды ўжо зусім лішнімі былі вашыя спатканні цяпер, калі ён ажаніўся. Яго можна апраўдаць, бо ён кахае цябе і пачуцці перамаглі рассудак, а ты ж яго не кахаеш, дык чаму ж яшчэ цяпер ускладняеш яму жыццё? Ты ў горадзе, дык тут сабе і хлопца шукай.

Сэрцайка



Дарагі Астрон! Не ведаю, што гэта такое, але ўжо другі раз сніцца мне, што я ў бальніцы. А тым разам дык снілася так.

Я ляжу ў бальніцы. Вечар. Хворыя жанчыны, што ляжаць у той зале, дзе я, ужо леглі спаць, накрыліся белымі коўдрамі. А я не кладуся спаць, стаю каля іх ложка ў нагах і хачу, каб якнебудзь з гэтай бальніцы выбрацца. Бачу, ідуць лекары ў нашу залу на абход, але мяне не кранаюць, ідуць далей. Я тым часам іду побач гэтага ложка, дзе ляжаць жанчыны, да акна, куды яны накіраваны галовамі. Пры акне на зямлі стаіць вазон. Вялікі, разлажысты, прыгожы. Быццам бы ён мой. Я ім захапляюся і думаю: добра было б узяць кавалачак, адламаць і пасадзіць яшчэ другі. Тут і прачынаюся.

Верная чытачка


Паважаная чытачка! Можа пасля гэтага сну і застаўся ў вас непрыемны асадак (нічога дзіўнага — побыт у бальніцы нікога не напаўняе радасцю!), але гэта нічога. Я ўжо не раз пісаў, што не заўсёды тое, што выглядае дрэнна ў сне, прадвяшчае нядобрае на яве. Так і тут. Сон ваш, уласна кажучы, ад пачатку да канца добры.

Паглядзіце самі: вы былі ў бальніцы (а яна ж вам снілася ўжо не ўпершыню!). Чакае вас усё добрае: можа гэта быць крэпкае здароўе, нейкі прыбытак, паспяховае завяршэнне важных спраў, адным словам, вы будзеце шчаслівая.

Пацвярджае гэты факт бель, якую вы бачылі, і той вазон, які стаяў каля акна. Быў жа ён вялікі і прыгожы. Чакае вас нейкае задавальненне.

Астрон





Свіронак у вёсцы Малявічы Дольныя гм. Саколка. *Фота М. Гайдука.*

Куток практычных ведаў




ШТО ПАВІННА БЫЦЬ У НАС НА КУХНІ?

Здаецца, што ўсе мы ведаем гэта, а ўсё ж... Здараецца яшчэ ў многіх гаспадынь, што ў нейкай місцы іх сям'я мыецца, а гаспадыня ў ёй мые пасуду, замешвае цеста. Бывае і так, што на адной і той жа дошачцы нарэзвае гаспадыня селядцы, каўбасу і гародніну. Найчасцей, аднак, універсальнымі лічаць яны каструлі, у якіх то кіпяцяць малако, то вараць суп, гародніну, а пасля тушаць мяса...

Рацыянальная падборка посуду да адпаведных страў часта яшчэ недаацэньваецца. А вазьмі зрабі, напрыклад, працуючая жанчына, змеленыя катлеты без мясарубкі! Спрабуй абыйсціся без цесака і добрага, вострага нажа! Сама я калісь бачыла, як змагалася суседка з адбіўной катлетай, прабуючы адбіць яе таўкачом.

Сёння некалькі слоў аб падставовых, неабходных прадметах на кухні — аб каструлях. Не важна, каб мець іх шмат, важна — каб мець адпаведныя. На сярэднюю сям'ю ў 4-5 асоб трэба мець прынамсі чатыры каструлі. Гэта — мінімум. Іх аб'ём павінен быць у 2-5 літраў, павінны яны быць рознай вышыні.



У глыбейшых каструлях варым суп, гародніну, кампот. Варачы гусцейшыя стравы, выкарыстоўваем ніжэйшыя, але больш шырокія каструлі. Для малака варта мець спецыяльную каструлю.

Мяса найлепш смажыць у спецыяльнай брытфане (так званы, цяжкі посуд). Тушым мяса ў каструльцы з таўсцейшым дном.

Патэльні на кухні павінны быць дзве. Вялікая, алюміневая ці стальная, і меншая, эмаліраваная.

Апрача таго, патрэбны чайнік (кіпяціць ваду) і чайнічак для эсенсіі, а таксама жараадпорны посуд для запяканак.

Зразумела, посуду можа быць больш. Неабходна ведаць таксама, што алюміневы посуд больш трывалы, чым эмаліраваны і страва варыцца ў ім хутчэй. Эмаліраваны посуд, аднак, не трымае пахаў і не паглынае тлушчаў. У ім, не апасаючыся, можна захоўваць розныя стравы, а ў алюміневым — не.

Гаспадыня



У канцы жніўня 1942 года, калі вучоба была ў асноўным завершана, Кірылу Арлоўскага выклікаў да сябе генерал. Арлоўскі коратка далажыў аб тым, што зроблена.

— Падрыхтоўка ідзе паспяхова, але байцы засумавалі па сапраўднай справе, — сказаў ён.

— Значыць, складам групы вы задаволены? — спытаў генерал.

— Баявы народ, сапраўдныя сокалы! — з гордасцю за сваіх байцоў адказаў Арлоўскі.

— Сокалы, кажаце? — генерал прайшоўся па кабінеце. — Дарэчы, як вы глядзіце, Кірыла Пракопавіч, калі мы так і назавём групу — „Сокалы"?

Арлоўскі згадзіўся.

— Калі ж „Сокалы" закончаць вучобу і будуць гатовы да вылету ў тыл праціўніка?

— Засталося няшмат — некалькі начных заняткаў па тапаграфіі, скачкі з парашутам. Праз тыдзень будзем гатовы, — цвёрда адказаў Арлоўскі.

Скачкі чамусьці адкладаліся, і гэта вельмі непакоіла камандзіра. Амаль усе прынятыя ў атрад байцы медыцынскую камісію прайшлі раней. Арлоўскі ж усё не праходзіў, і яго не пакідала трывожная думка: ці дазволяць урачы яму, 47-гадоваму чалавеку з хворым хрыбетнікам, скакаць з самалёта? Гэтае прадчуванне не ашукала камандзіра: урачы катэгарычна забаранілі яму скакаць з парашутам. Давялося Арлоўскаму ісці да самога старшыні Цэнтральнай ваенна-экспертнай камісіі ваенурача 2-га рангу Ткачука. Ткачук не змог адмовіць камандзіру.

Не адмовіў — і неўзабаве пашкадаваў аб гэтым: першая спроба для Арлоўскага была няўдалай — прызямляючыся, ён правай нагой наступіў на камень-валун, які немаведама адкуль ўзяўся на роўным полі. Востры боль працяў усё цела.

— Нічога, таварышы. Гэта толькі ўдар. Да вылету ў тыл усё пройдзе, — спрабаваў суцешыць байцоў і сябе камандзір. Але ступаць на нагу ён не мог, і проста з поля яго адправілі ў шпіталь.

Цяжка перажывалі здарэнне з камандзірам байцы, яны паспелі палюбіць строгага і патрабавальнага, але справядлівага і клапатлівага кіраўніка.

Ледзь не кожны дзень прыходзілі ў шпіталь то Рыгор Івашкевіч, то Хуста Лопес, то Іосіф Якубоўскі.

Дні праз тры Івашкевіч прыехаў да Арлоўскага з усімі байцамі групы. І ў камісара, і ў байцоў быў нейкі разгублены, вінаваты выгляд. Павітаўшыся з камандзірам і спытаўшы, як ён сябе адчувае, Івашкевіч змоўк. Маўчалі і байцы.

— Што здарылася? Ці не натварылі чаго, саколікі? — устрывожыўся Арлоўскі.

— Нічога мы не натварылі. Прыйшлі развітацца з вамі, Кірыла Пракопавіч, — апусціўшы вочы далажыў камісар.

— Гэта яшчэ што за фартэль?

— Камандзірам групы генерал назначыў старшага лейтэнанта Пагодзіна. Паслязаўтра вылятаем у тыл.

Пайшоў Івашкевіч з байцамі, а Арлоўскі адразу ж пазваніў генералу. Ён настойліва прасіў генерала тэрмінова прыняць яго.

— Вы хворы. Папраўцеся, тады і пагаворым, — быў сухі адказ.

— Для мяне гэта важна, вельмі важна, — настойваў на сваім Арлоўскі. — Я зараз выеду да вас.

— Добра, угаварылі. Толькі вам не трэба парушаць пасцельны рэжым. Я сам прыеду ў шпіталь.

— Я не дыпламат, скажу прама: прызначыўшы замест мяне Пагодзіна, вы яўна паспяшаліся, — хвалюючыся, сказаў Арлоўскі генералу, калі той зайшоў у палату.

— Настойлівасць — добрая рэч, але ў вас яна пераходзіць ва ўпартасць. А ўпартасць, як вядома, да дабра не прыводзіць, — генерал не хаваў раздражнення.

— Гэта не ўпартасць.

— Маёр Арлоўскі, прашу не перабіваць. Урачы зрабілі заключэнне, што вы па стане здароўя не можаце скакаць з самалёта. Вы не згадзіліся, упарта стаялі на сваім, па сутнасці, вымусілі Ткачука даць згоду на скачок. Чым усё гэта скончылася, вядома: вы апынуліся ў шпіталі, Ткачук атрымаў вымову. З-за вас затрымаўся вылет групы ў тыл праціўніка. І нават цяпер, з хворай нагой, вы зноў настойваеце на сваім — хачу ляцець са сваёй групай, і ўсё! Хіба ж гэта не ўпартасць?

— Так, толькі са сваёй групай! З Івашкевічам, з Лопесам, з Якубоўскім, Пятрушкам, Забаўнюком. Я іх падабраў, падрыхтаваў, ведаю, на што кожны з іх здольны.

— А што загадаеце рабіць? — пачаў „адыходзіць" генерал. — Хай уся гру-

ТРЫБУНА чытачоў

Сталі як адзін

Агульнапольскі камітэт Фронту адзінства народу аб'явіў конкурс „Самаўпраўленне на службе жыхароў“, у якім прымаюць удзел пасёлкавыя камітэты разам з радамі кааператываў: жыллёвага, будаўніцтва, „Сполэм“, працы.

Да конкурсу гэтага прыступіў пасёлкавы камітэт № 4 у Гайнаўцы з кааператывам працы і паслуг ручной бранжы ў Гайнаўцы.

Была апрацавана супольная праграма працы, якую зацвердзілі на супольным пасяджэнні. У канцы верасня пры дапамозе намесніка начальніка горада інж. Станіслава Кастэры быў арганізаваны грамадскі пачын на вуліцы Спіральнай на пасёлку № 4. У суботу пасля поўдня адзінаццаць самазвалаў вазіла жвір і пясок да позняга вечара, а жыхары вуліцы Спіральнай раскідалі той пясок.

Найактыўнейшы ўдзел праявілі Русіловіч Ян, Мразоўскі Лявон з жонкай, Лукша Анастасія, Красько Пракоп, Матысякова, Грабоўская, Пракапюк і Качмаркова Марыя.

Трэба сказаць, што Качмаркова Марыя і Красько Пракоп — людзі пажылыя, ім ужо па 80 год. Але не сышлі з чыну да канца.

Э. Вайсковіч,
Старшыня пасёлкавага камітэта № 4



СЭРЦА

Сэрца
выйму з грудзей
З сэрцам
пайду да людзей
З сэрцам
у далоні
Як п'яны
як шалёны
Паглядзіце!
яно жывое
Паглядзіце!
яно людское

Міша Андрасюк,
Гайнаўскі беларускі ліцэй

РЫБАК

Ездзіць па возеры
З вудачкай зграбнаю,
Ну — заўзяты рыбак.
У травы дзівіцца
У кусты заглядае,
Ці дзе не выйшаў шчупак!

Пятрусь Гінціт,
Гайнаўка

па бяздзейнічае? Чакае, пакуль вы выйдзеце са шпіталя? Ды і Пагодзін — нядрэнны камандзір.

— Супроць Пагодзіна я нічога не маю. Але для групы ён чалавек новы, ён не ведае магчымасцей кожнага байца.

— Загад адмяніць я не магу, але вы не адчайвайцеся. Работа для вас знойдзецца і тут, у Цэнтры.

— Не, не! — рашуча запярэчыў Арлоўскі. — Толькі не гэта. Я хачу ў тыл.

— Што з вамі зробіш? — генерал развёў рукамі. Яму яўна падабался настойлівасць Арлоўскага.

Вылет „Сокалаў“ затрымліваўся: над маскоўскімі аэрадромамі некалькі дзён вісеў густы, шчыльны туман. Праяснела неба над Масквой, але партызаны з-пад Баранавіч паведамілі, што там надвор'е сапсавалася. У пачатку кастрычніка група на чале з Пагодзіным усё ж вылецела з Масквы, але непадалёк ад Мінска самалёт быў абстраляны гітлераўскімі зенітчыкамі, атрымаў некалькі прабоін. Група вярнулася ў Маскву.

У гэты час Арлоўскі выйшаў са шпіталя. Яго выклікаў да сябе генерал.

— Вашу просьбу падтрымалі. Паляціце ў тыл са сваімі „Сокаламі“, — аб'явіў ён узрадаванаму Арлоўскаму.

(Працяг будзе)

„Адпачынак“

З маладых год я быў сталым наведвальнікам кіно. Абставіны змяніліся, калі кватэра мая ўзбагацілася цудоўнай здабычай нашага стагоддзя — тэлевізарам.

Апошні раз выбраўся я ў кіно ў палове жніўня. І ўражанні, якія я вынес, на доўгі час не дазволяць мне наведаць кіно „Ляснік“ у Гайнаўцы.

Як і ў кожным кіно, перад фільмам была кінахроніка. Потым распачаўся фільм. Без ніякага перапынку. Вялікую ўвагу я звяртаю на пачатак фільма, калі паказваюць выканаўцаў галоўных роляў, рэжысёраў і гэтак далей. А тут я нічога не даведаўся, бо ў залу бязупынна ўваходзілі спозненыя гледачы.

Прывыкнуўшы крыху да цемры, спозненыя гледачы пачалі садзіцца на свае месцы. І тут распачалася такая скрыпатня, такі грукат, што нікому ў галаве не было звяртаць увагу на тое, што дзеецца на экране.

Праз паўгадзіны пачалі балець вочы. Думаю, што плёнка ў такім тэхнічным стане не падыходзіць нават „на правінцыю“. Каля палавіны сеанса людзі пачалі адзін за другім знімаць вопратку. Пагода не была такая гарачая, але хтосьці забыў у час перапынку ўключыць вентыляцыю. Не было чым дыхаць.

Захапляцца фільмам не дазваляла таксама частка маладых гледачоў з апошняга рада. Гледачы гэтыя былі ва ўзросце, калі такія фільмы ім глядзець яшчэ рана. Няўжо кантралёр не ў сілах адрозніць дарослага мужчыну ад 13-гадовага хлапчука? Але не толькі яны не дазвалялі сваім рогатам глядзець фільм. Раз-пораз раздаваліся ў зале гукі музыкі, ні ў чым не прыстасаваныя да фільма. Я ўжо пачаў нават сумнявацца, ці апаратар гуку не памыліў музычнага фону. Усё выяснілася пасля заканчэння сеанса. Побач з кіно на пляцоўцы грымела, не менш як на пяць узмацняльнікаў, дыскатэка. Аж вушы лопалі. Ад злосці я аж... засмяяўся. Вось і адпачні пасля рабочага дня ў доме культуры. Іронія!

Сядзем

Няўжо так і скончыцца?

Прачытаў я ў „Ніве“ № 37 (1072) ад 12 верасня артыкул пад загалоўкам: „Як даехаць у Кнаразы“ і рашыў падтрымаць Івана Непаседу за тое, што ён клапоціцца пра нашу дарогу Кнаразы-Храбалы. Я ў мінулым годзе пісаў пра гэта ў публікацыі: „Ужо лета празвінела“.

Пасля на гэтай дарозе работа закіпела да вялікага марозу, пакуль выкарысталі гроны — суму 300.000 зл., прызначаныя гмінай у Храбалах.

А ў бягучым годзе ад 1 ліпеня Храбалоўская гміна ўлілася ў склад Бельскай гміны, а Бельская гміна, дык не ведаю, як падыйдзе да гэтай справы. Я думаю, што павінна зацікавіцца, бо і дакументацыя ж каштавала і яшчэ зімой інжынер з управы мясцовых дарог Ян Вавжыняк даў у „Ніве“ адказ, што атрымалі ад гміны новых 200.000 зл. на гэтую работу.

Кірылюк Міхал,
Кнаразы

Да сяла Крывяцічы

Адрэзак дарогі паміж Орлям і Крывяцічамі ў дажджлівую восень і вясной быў пераважна непраездным. Жыхары сяла Крывяцічы з вялікім клопатам вазілі штучныя ўгнаенні, збожжа і іншыя тавары. Часта арганізавалі пачыны — вазілі жвір і капалі равы па абапал дарогі. Дапамагло сялянам Раённае прадпрыемства будовы дарог і мастоў у Бельску. Прадпрыемства гэта палажыла асфальт на дарозе. Цяпер, як кажуць, па ёй „хоць каціся“.

За гэта рабочым і дырэкцыі спамянутага прадпрыемства складае сяло Крывяцічы шчырую падзяку.

Але цяпер паабапал гэтай дарогі трэба пасадзіць крыху дрэўцаў. Праўда, яны растуць, але месцамі прагаліны вялікія.

Іван Кірызюк

Найлепшы інтэрнат

Інтэрнат групы сельскагаспадарчых школ у Бельску з'яўляецца адным з лепшых інтэрнатаў у Беластоцкім ваяводстве. За школьны год 1975/76 атрымаў ён дыплом Міністэрства асветы і выхавання, Галоўнага праўлення Саюза польскіх настаўнікаў, Галоўнага савета Федэрацыі сацыялістычных саюзаў польскай моладзі і рэдакцыі дзённіка „Сцяг маладых“, у якім выказваюць прызнанне за дасягненні ў выхаваўчай працы, здабытыя ў спаборніцтве на званне „Перадавога інтэрната ў краіне“.

Працай інтэрната кіруе Я. Барышэўская.

Мікалай Няплоха

Зборшчык

Ужо 22 гады Сяргей Назарук у вёсцы Вітава, Дубіцкай гміны, скупляе ад сялян ягады і грыбы. Зборшчык вельмі цэніць сваю працу. Ён сам са сваёй сям'ёю таксама вельмі многа збірае грыбоў і ягад.

Блізкая Белавежская пушча і навакольныя хваіны багаты грыбамі. Сюды па ягады і грыбы прыязджаюць нават людзі здалёк. А назбіраўшы замнога, на месцы ў Назарука прадаюць. Усім гэта аплачваецца.

М. Панфілюк

Рыгор Яканюк

Ужо другі год, як у дубіцкай зле́ўні малака працуе мясцовы хлапец Рыгор Яканюк. Працаўнік вельмі дбае пра чысціню, парадак, выгляд, як і ў сярэдзіне, так і звонку свайго месца працы — будынка зле́ўні. У яго ўсюды парадак. Таксама важная дэталь — малачар добрасумленны і мо гэта найважнейшае. Таму людзі цэняць і паважаюць Рыгора.

Некаторыя малачары маюць клопаты з устанаўленнем працэнтаў на малако. Наш малачар гэтых цяжкасцей не ведае і, як кажуць, усё ідзе, як найлепш. У гэтых штомесячных спісках выплат за малако не відаць ніякіх паправак кантролю і бухгалтэрыі. Р. Яканюк мае вышэйшую адукацыю, аднак любоў да працы ў родным месцы і добрай бацькавай гаспадаркі прымусіла Грышу застацца ў сяле. Штодзень раніцай ідзе ён у зле́ўню і аддана выконвае свой абавязак малачара.

Апрача дубіцкіх дастаўцаў малака, сюды прывозяць коннай павозкай малако з вёсак Чэхі Арлянскія і Рутка. Кожны месяц сума прададзенага дзяржаве малака ў Дубічах Царкоўных дасягае 160 000 — 170 000 зл.

Р. Яканюк працуе з бацькамі на гаспадарцы. Маюць яны свой уласны трактар і іншыя сельскагаспадарчыя машыны і прылады. Машыны Рыгор абслугоўвае сам дасканала.

М. Панфілюк

Не зубр, а бясплатны цырк

У гэтым годзе я з дзяцьмі і жонкай выбраўся самаходам па Польшчы. Самаход у мяне свой, так што я пабачыў усе прыгажэйшыя закуткі радзімы. Ды не вельмі задаволены быў гэтай экскурсіяй, бо давялося пабачыць такі цырк, аб якім і не марыў. Вось заехаў я ў Белавежу. Цудоўная турыстычная мясцовасць у Белавежскай пушчы! Я там ніколі раней не быў. Жонка з дзяцьмі таксама. Так што нам прыемна было паглядзець музей і іншыя цікавыя аб'екты. Мы там заначавалі.

На другі дзень паехаў я з дзяцьмі і з жонкай у рэзерват зуброў. Прыязджаю я на пляц каля агароджы з зубрамі, стаіць многа аўтакараў і прыватных машын. З'ехалася многа людзей. Але бачу, у адным месцы пры ўваходзе за агароджу сабраўся найбольшы натоўп людзей. Узяў я дзяцей, ідзем у браму, каб убачыць у рэзерват і тут... я даведаюся, чаму так многа людзей сабралася. У браме я ўбачыў п'яную жанчыну, яна ляжала на зямлі і вельмі ругалася. Людзі стаўпіліся з усіх бакоў і нельга было ўвайсці ў рэзерват. Некаторыя смяяліся, іншыя абуряліся. Я не мог на гэта глядзець і, не чакаючы, схапіў дзяцей і жонку і пайшоў назад, не пабачыўшы зуброў.

Але нарадзіліся ў мяне пытанні: ці няма рады на такія здарэнні, ці можна дазволіць людзям выдурняцца ў публічным месцы?

В. А.
(Адрас вядомы рэдакцыі)

А мы пад лесам

Некаторыя гарады ляжаць над рэчкамі, азёрамі, а наш горад — Гайнаўка ляжыць на ўскраі Белавежскай пушчы. Пушча акрыляе горад з усходняга боку на працягу пяці кіламетраў. Мы, жыхары Гайнаўкі, вельмі задаволены такім суседам.

Сусед наш багаты і добры. З багацця яго бясплатна карыстаюцца жыхары Гайнаўкі. У кожным доме знойдзеце варэнне з малін, чарніц, брусніц, суніц. Грыбы розных гатункаў — квашаныя, салёныя і сушаныя. А як добра ўзяць да чаркі ў гасціне марынаваныя зялёнкі ці апенькі!

Прызвычаіліся мы да нашага лесу і ніхто не хацеў бы замяніць яго на рэчку ці возера. Летняй парой у нашым горадзе ёсць дзе адпачываць.

Але лес, як жывая істота, патрабуе добрай апекі, а мы прызвычаіліся толькі браць з яго, а не бачым розных варварстваў і здзекаў над лесам з боку злых людзей.

Як усе мы ведаем, у Белавежскую пушчу едуць экскурсіі з цэлай краіны. Добра на ўзлонні прыроды разлажыцца, з'есці і выпіць. Але разложыцца такая экскурсія на гадзіну, а пакідае пасля сябе знішчэнне і бруд, які адрабіць нялёгка.

Ды найгорш дастаецца пушчы ад жыхароў Гайнаўкі. Немагчыма прайсці берагам лесу каля горада. Украіна лесу завалена розным смеццем, банкамі, бутэлькамі і т.п. Нечысць гэтую робяць жыхары прыватных дамоў, якія чысцяць свае сялібы, але ўвесь бруд вывозяць у лес. З імі цяжкая вайна, але пачаць як павінны ўсе, каму дарагі лес, усе ўстановы, усе людзі добрай волі. Добра было б, каб на гэтую справу звярнула большую ўвагу лясная стража і каб карала за засмечванне пушчы.

Э. Вайсковіч

У АДКАЗ НА НАШУ КРЫТЫКУ

ДА ПУБЛІКАЦЫІ „БЕСКЛАПОТНАСЦЬ“, „НІВА“, № 28 АД 11.VII.76.

Адказвае: Urząd Gminy w Kleszczelach.

W odpowiedzi na notatkę prasową, opublikowaną w tygodniku białoruskim „Niwa” w sprawie połamanego mostu na drodze koło wsi Toporki, Urząd Gminy w Kleszczelach informuje, że przepust na drodze Kleszczele — Orla (koło wsi Toporki) zostanie naprawiony w m-cu październiku bieżącego roku.

Naprawa przepustu przeciąga się z powodu braku materiałów i wykonawcy.

Z up. Naczelnika Gminy
Lubomira Wilk
Sekretarz Biura

ДА ПУБЛІКАЦЫІ „НЕ ПРАЕХАЦЬ, НЕ ПРАЙСЦІ“, „НІВА“ № 29 АД 18.VII.76

Адказвае: W odpowiedzi na notatkę prasową zamieszczoną w tygodniku „Niwa” pt. „Nie przejechać, ani przejść”, a dotyczącą remontu drogi Czyże-Łuszcze, Urząd Gminy w Czyżach informuje co następuje:

Zgodnie z planem społeczno-gospodarczym rozwoju gminy na 1976 r. uchwalonym na Sesji Gminnej Rady Narodowej w miesiącu grudniu 1975 r., fundusz gminny na budownictwo drogowe skierowany został na dokończenie budowy drogi Czyże-Rakowicze.

W związku z brakiem dotacji z jednostki nadrzędnej na budownictwo drogowe w 1976 r., budowa lub modernizacja innych dróg uzależniona była i jest od posiadanych skromnych rezerw budżetowych i zaangażowanego udziału społeczeństwa w czynie społecznym przy modernizacji tych dróg.

Potrzeby budowy lub modernizacji dróg na terenie naszej gminy są duże. Rokrocznie budujemy po kilka przepustów drogowych oraz remontujemy odcinki dróg w ramach organizowanych czynów społecznych. Wspomniana droga Czyże — Łuszcze nie jest remontowana między innymi z tego tytułu, że brak jest zainteresowania tą sprawą ze strony mieszkańców wsi Czyże i Łuszcze.

Dowiodło tego ogólnowiejskie zebranie mieszkańców wsi Łuszcze w dniu 21 września 1976 roku. Miejscowa ludność, mimo posiadania 9 traktorów, nie wyraziła zgody na dowóz żwiru na wspomnianą drogę, mimo że Urząd Gminy zapewnił żwir i ładowacz.

W tej sytuacji wspomniana droga zostanie wyremontowana z shwilą wybudowania lub zmodernizowania ważniejszych społecznie tras, jak Klejniki — Hukowicze czy Wólka — Kuraszewo, gdzie przewidziane jest kursowanie autobusu, dowożącego dzieci do szkół zbiorczych i większe jest zainteresowanie ludności czynami społecznymi.

Wz. Naczelnika Gminy
Grzegorz Mackiewicz
Sekretarz Biura

„Niwa” — Tygodnik RSW „Prasa—Książka—Ruch”. Skr. poczt. 149. 15-950 Białystok. TELEFON 2-32-41. Wydawca Przedsiębiorstwo Wydawniczo-Kolportażowe RSW w Białymstoku. PRENUMERATA: Oddziały „Ruchu”, urzędy pocztowe i listonosze. Indeks 36911/36671.

КАСТУСЬ У СУДЗЕ

Суддзя: — Чаму вы дайшлі да такой ступені ап'янення?

Кастусь: — Я трапіў у дрэнную кампанію. Нас было чацвёра. У мяне была бутэлька гарэлкі, а апошнія трое не захацелі піць!

ВЫТЛУМАЧЫЎ

— Чаму ты ставіш крыжык у маім дзённіку замест таго, каб проста распісацца? — пытае Пятрук бацьку.

— Я не хачу, каб твой настаўнік падумаў, што ў такога двоечніка, як ты, бацька ўмее чытаць і пісаць.

НА ШЫРОКІМ СВЕЦЕ

Гаспадар фірмы праінструктаваў новую сакратаршу, што ёй трэба адказваць наведвальнікам.

Прыходзіць першы наведвальнік. Яна пытае:

— Ці прадстаўляеце вы іншую фірму? Ці хочаце атрымаць грошы па рахунку? Ці з'яўляецеся сябрам дырэктара?

— І тое, і другое, і трэцяе.

— У такім выпадку, — заяўляе сакратарша, паглядзеўшы ў свае запіскі, — дырэктар зараз на пасяджэнні, ён выехаў на два тыдні, і я зараз паведамлю яму аб тым, што вы прыйшлі.


*

У тэатры перад пачаткам другога акта на сцэну выходзіць адміністратар і гаворыць:

— Панове, адзін з гледачоў згубіў у антракце бумажнік з дзвюма тысячамі франкаў. Ён прапануе сто франкаў таму, хто зверне яму згубу.

Маўчанне, потым з залы раздаецца голас:

— А я прапаную дзвесце франкаў.



Усё людское нам не чужое.

— Увесь лес прайшоў, а дзе тыя грыбы?

ЁН І Я

Я з Данілам Тапарковым
Дружна жыў, душа ў душу.
Чалавек ён быў талковы,
З плеч не сек, я вам скажу.

Не люблю размоў-сутычак,
Хоць і ранг вышэйшы меў.
Я — ляснік,
А ён — ляснічы.
Службу кожны разумеў.

Хвойнік спляжыў я на дровы.
Іншы б — з'еў! А мой: „Сядай..."
...Ён паўслова,
Я — тры словы, —
І даклад гатоў, чытай!

І чытала ўсё начальства,
Факты брала ў свой даклад:
„Ані трэсачкі на ўчастак,
Ані пння — парадак, лад!.."

Працавалі шчыра, з сэрцам,
Слоў і звад не зналі злых.
Ён — бярвенца,
Я — паленца.
Хіба многа на дваіх?

Дом ён меў,
І я меў хатку
У райцэнтры, дзе чысцей.
З вінаватых для парадку,
Браў ён — дзве,
А я — дзесятку.
Ён — праз дзень,
А я — часцей...

Тут ужо не мог я схібіць.
Хоць ты шэф, але збачай!..
За маё ж люблю ён выпіць,
А гарэліца — не чай!

Я з Данілам Тапарковым
Дружна жыў, душа ў душу.
Наламалі ўсё-ткі дроў мы,
І нямала, вам скажу.

Бы свінцовыя, галовы.
Не схаваць вачэй нідзе.
Ён маўчыць,
І я — ні слова.
А над намі суд ідзе.

Мікола Чарняўскі



— Як вы сябе адчуваеце?

ЭЛАЧКА

— Элачка, дзіцятка, схадзі да мясніка і пагляздзі, ці ёсць у яго свіныя ножкі.

Праз паўгадзіны Элачка вяртаецца.

— Ну што, бачыла? — пытае маці.

— Не, я чакала-чакала, ды ён так і не зняў ботаў, а папрасіць я пасаромелася...

ХВОРАЯ

— Як жонка?

— Страшна! У яе неўралгія, неўрыт, нефрыт, неўрастэнія і пачынаецца неўроз...

— Чакай, немагчыма адчуваць усе сімптомы адразу!

— Магчыма. Яе маці падарыла ёй медыцынскі слоўнік, і яна зараз прапрацоўвае літару Н...

Канфлікт

Дзед чытаў газету, лежачы на канапе, баба сядзела ў крэсле і глядзела па тэлевізары хакей, а ўнук рыхтаваў урокі.

— Дзед, што такое канфлікт? — спытаў унук.

— Ну гэта, калі два бакі, не паладзіўшы... Ты, унучак, лепш спытай у бабы, я заняты.

— Баба, што такое канфлікт?

— Не перашкаджай, — сказала бабуля, не адрываючы вачэй ад экрана, дзе якраз у гэты момант каля варот любімай яе каманды ўтварылася куча з ігракоў. Але ўсё ж яна паспрабавала растлумачыць:

— Канфлікт — гэта калі двое ці некалькі чалавек за што-небудзь паспрачаліся.

— Як паспрачаліся? — не зразумеў унук.

— Старэ, — павярнулася баба да дзеда, — растлумач малому. Не такі ты ўжо заняты.

— Дзед, баба сказала, каб растлумачыў мне, што такое канфлікт, бо ты не вельмі заняты.

Дзед адараўся ад газеты, зірнуў на бабу.

— А ты вельмі занятая? Усе вечары перад гэтай скрынкай праседжваеш. Хакей табе патрэбен. Можа, і сама з клюшкай на лёд выбежыш?

— Гэта я праседжваю? — не ўтрымалася баба. — А ты што робіш? Лежнем ляжыш на канапе. А з унукам пазаймацца і часу не знойдзеш.

— Дзед, што такое канфлікт?

— Пачакай, унучак. — Дзед зняў акуляры, кінуў на канапу газету. — Значыць, я лежнем ляжу? А хто маю справу робіць? Ты?

— А хто па дому ўсё робіць? Ты за мяне? Цябе ж, старога карча, ні ў магазін не пашлеш, ні на рынак.

— Я корч? А ты ведаеш, хто ты?..


— Дурань ты сам, — апярэдзіла баба дзеда.

— Ах так! — падхапіўся дзед з канапы. — Качарга ты ржавая!

Чым бы скончылася гэта сутыкненне, каб не ўнук? Ён стаў паміж дзедам і бабай і закрычаў:

— Стойце! Дзед і баба, пачакайце! Не трэба мне тлумачыць... Я ўжо сам зразумеў, што такое канфлікт.

Васіль Хомчанка



— Выбачайце, мадам, калі будзе крыху дымна.

ПЕСНІ ПА ЗАЯЎКАХ

Па просьбе Анны Бушко з Белавежы, Юркі Рыбака з Галадоў, Галены Федарук з Зубава, Анкі, Надзі і Якуба Нікіцюкоў са Ступнік, Веська Мартынюка і Лявона Апалінскага з Паўлаў змяшчаем песню

Rysunek na szkle

słowa: Janusz Kondratowicz
muzyka i wykonanie:
Krzysztof Krawczyk

Jeszcze sam się uczę siebie,
żyję tak jak umiem żyć —
do utraty tchu.
Raz mi gorzej z tym, raz lepiej,
rzucam się
w zdarzeń rwący nurt.

Jak w ucieczce, jak w podróży
do zamkniętych pukam drzwi,
byle serce nieść.
I choć nic się nie powtórzy,
jeszcze raz
myślą sięgam wstecz.

O, jest gdzieś niebo jak len,
ooo, noc za krótka na sen,
o, dom, gdzie czeka znów ktoś
i gdzie miejsca jest dość
dla spóźnionych gości.

O, twój rysunek na szkle,
tylko na nim już dziś
nie ma mnie.

Idę dalej, żyję prędzej,
pragnę, tracę to, co mam —
czas doradca złym.
Wieczorami piszę wiersze,
chociaż ty
już nie czytasz ich.

Biegną wiosny i jesienie,
coraz bardziej dzieli nas
morze zwykłych spraw.
Mam już tylko to wspomnienie,
choć i w nim
mniej tych jasnych barw.

O, jest gdzieś niebo jak len...

Ale kiedyś sam w pół drogi
stanę, cisnę nagle w kąt
cały ten mój świat.
Twarz ochłodzę kroplą wody,
jakby mi
znów ubyło lat.

I odnajdę tamten ogień,
i gościnny domu próg,
i przyjazną dłoń.
Lecz czy tamtą twą urodę
zwróci nam
rzeki bystra toń?

O, jest gdzieś niebo jak len...

ВОПЫТНЫ ДРЭСІРОЎШЧЫК

— Вопытны дрэсіроўшчык можа навучыць свайго сабаку практычна ўсяму. Я, напрыклад, прывучыў свайго сабаку не ляжаць пад канапай, а гэта было яго ўлюбёнае месца.

— І як жа гэта вам удалося?

— Вельмі проста: я адпілаваў ад канапы ножкі.




АКУЛІНЫЯ СТРАСЦІ

Усё пачалося з амерыканскага фільма „Сківіцы", больш дакладна з яго „галоўнага героя" — акулы-людаеда. Як заявіў новазеландскі кінадзялок Хемінгтон, толькі за першыя дні дэманстрацыі „Сківіцы" прынеслі „многія і многія тысячы долараў". Мясцовыя газеты пішуць, што ў Аўстраліі ў час кінасеанса нехта памёр. Затое другі аўстраліец — нейкі Уолі Гібінс выказаў жаданне за мільён долараў сустрэцца з акулай у „падводнай карыдзе". „Усякі, хто стане глядзець на гэта, — ідыёт. Але я быў бы дрэнным бізнесменам, калі б не ўзяўся за такую справу", — адгукнуўся на прапанову Гібінса амерыканскі прадзюсер Уільям Сарджэнт.

Ну, а сапраўдныя акулы? Новая Зеландыя, як вядома, акружана морамі. Статыстыка сцвярджае, што ахвярамі акул за апошнія 120 гадоў сталі дзевяць чалавек. Аднак у сувязі з дэманстрацыяй „Сківіц", „падмацаванай" выпускам велізарным тыражом аднайменнай кнігі, новазеландскія пляжы ў самы разгар гарачыні аказаліся намнога больш пустыннымі, чым звычайна. Іх уладальнікам прыйшлося патраціць вялікія сродкі на рэкламу, каб зменшыць паніку. Адным словам, пакуль адны дзялкі нажываліся на акулах, другія цярпелі страты.

РАННЯЕ СТАРЭННЕ

У гісторыі маюцца выпадкі вельмі ранняй старасці. Так, венгерскі кароль Людвіг II у 14 год меў густую бараду, а ў 15 год ажаніўся, у 18 год пасівеў і ў 20 год памёр з усімі прыкметамі адрахлення.



Добры глаўбух павінен быць падобны да Пізанскай вежы: заўсёды схілены перад начальствам, але ніколі не падаць.